ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ўдатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 10 сакавіка 1930 г.
№ 58 (3566)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Гомельскі ўрок

Пастанова парткалегіі ЦКК УсеКП(б) аб становішчы Гомельскае партыйнае арганізацыі дае бальшавіцкую ацэнку раду буйных апартуністычных памылак былога Гомельскага парткіраўніцтва.

Гэта пастанова мае вялікае палітычнае значэньне як для Гомельскае партарганізацыі, так і для ўсяе КП(б)Б.

Апартуністычныя памылкі Гомельскага парткіраўніцтва рашуча асуджаны. Рад непасрэдных ганіцеляў рабкораў, заціскальнікаў самакрытыкі прыцягнуты да суровае адказнасьці. Былое кіраўніцтва Гомельскае партарганізацыі аказалася нездольным даць адпор гэтым антыпартыйным элементам і нават было прыцягнута імі на шлях заціску самакрытыкі.

Пастанова ЦКК УсеКП(б), як і Ц. О. нашае партыі «Правда» даюць ацэнку гэтым памылкам былога Гомельскага кіраўніцтва, як апартуністычным, падкрасьліваючы такім чынам, **характар** скрыўленьняў палітычнае лініі партыі, дапушчаных Гомельскім кіраўніцтвам. Гэта ацэнка супадае з тою ацэнкаю памылак Гомельскага парткіраўніцтва, якая дадзена ў адпаведных рашэньнях ЦК і ЦКК КП(б)Б. Пастанова УсеКП(б) ухваляе мерапрыемствы вышэйшых парторганаў Беларусі, якія (мерапрыемствы) накіраваны на аздараўленьне Гомельскае арганізацыі.

Адначасова парткалегія ЦКК УсеКП(б) канстатавала, што рад выяўленых памылак Гомельскага парт кіраўніцтва «не знайшоў своечасовага выпраўленьня з боку вышэйшых кіруючых парторганаў Беларусі».

Урокі Гомельскае справы паказваюць, што недастаткова выказвацца на словах за самакрытыку, за ўмацаваньне рабочае актыўнасьці і сувязі з масамі. Трэба **на справе** даваць бязьлітасны адпор апартуністым, заціскальнікам самакрытыкі. Бяз гэтага рашучага адпору апартуністычным элементам атрымліваюцца скажэньні партыйнае лініі, ствараецца абстаноўка заціску самакрытыкі ў арганізацыі, ствараецца такое становішча, якое фактычна было ў Гомелі, калі кучка апартуністых знаходзіць сабе прыкрыцьцё ў памылках парткіраўніцтва.

Урокі памылак былога Гомельскага кіраўніцтва выразна паказваюць, што заціск самакрытыкі вядзе да адрыву ад мас. Лёгічным вынікам гэтых праваапартуністычных памылак Гомельскага парткіраўніцтва ў пытаньнях самакрытыкі зьявіліся сур'ёзьнейшыя прарывы на іншых вучастках работы.

Толькі ў абстаноўцы заціску самакрытыкі і глушэньня актыўнасьці мас. толькі ў абстаноўцы масавае расправы над рабкорамі, маглі быць дапушчаны прарывы, якія былі ў Гомелі. Адсутнасьцю самакрытыкі тлумачыцца і тое, што ў Гомелі былі дапушчаны буйныя прарывы на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва, што ў Гомелі не даваўся рашучы адпор вылазкам вялікадзяржаўных шавіністых супроць беларусізацыі, таксама, як і шавіністым іншых колераў. Заціск самакрытыкі бязумоўна адыграў сваю ролю і ў прарывах, якія дапушчаны на фронце барацьбы за прамфінплян. Пры заціску самакрытыкі парткіраўніцтва не магло павесьці за сабою рабочыя масы, не магло з посьпехам выконваць пастаўленыя перад ім задачы.

Гомельская партарганізацыя павінна глыбока ўсьвядоміць гэты ўрок і зрабіць з яго палітычныя вывады. Гомельская партарганізацыя павінна пабальшавіцку ўзяцца за безадкладнае ажыцьцяўленьне задач, паказаных у пастановах ЦКК УсеКП(б), ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Узьняць самакрытыку на нябывалую вышыню, узмацніць барацьбу з усялякімі ўхіламі ад лініі партыі, дабіцца ўдарных бальшавіцкіх тэмпаў работы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, мабілізаваць рабочыя масы на барацьбу за выкананьне і перавыкананьне прамфінплану, павесьці масы батракоў, беднякоў і сераднякоў на барацьбу за калектывізацыю вёскі, за ліквідацыю кулака, як клясы—такая катэгарычная дырэктыва партыі, якую Гомельская партарганізацыя павінна выканаць і бясспрэчна выканае.

Новае ў рабочых масах, новыя вялікія зрухі і магутны ўздым творчае актыўнасьці мас, Гомельскай партарганізацыі трэба поўнасьцю выкарыстаць для самага рашучага ўзмацненьня сваёй работы на ўсіх вучастках. Трэба з бальшавіцкаю рашучасьцю ўзяцца за выпраўленьне прарываў, дапушчаных на вучастку нацыянальнага будаўніцтва, за клясавае камуністычнае, інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Мы глыбока ўпэўнены, што камуністыя Гомельшчыны, на чале са сваім новым кіраўніцтвам, з бальшавіцкаю энэргіяю і ўпартасьцю ліквідуюць прарывы і здолеюць мабілізаваць масы на выкананьне задач партыі.

Разгортваючы крытыку і самакрытыку, ня гледзячы на асобы, змагаючыся з тымі, хто будзе імкнуцца хвалю самакрытыкі выкарыстаць супроць партыі, Гомельская партарганізацыя павінна максымальна ўзмацніць барацьбу на два франты, накіроўваючы галоўны агонь па тэорыі і практыцы праваапартуністычнага ўхілу і не паслабляючы рашучае барацьбы з «левым» апартунізмам, з рэшткамі трацкізму.

ПАТРАБУЕМ БЯЗЬЛІТАСНА ПАКАРАЦЬ АГЕНТАЎ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ—УКРАІНСКІХ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ

Заслухаўшы паведамленьне аб судовым працэсе, які распачнецца гэтымі днямі над выкрытай на тэрыторыі Савецкай Украіны контр - рэвалюцыйнай арганізацыі—«Саюз Вызваленьня Украіны», агульны сход інжынэрна-тэхнічных сіл і навуковых працаўнікоў гор. Менску патрабуе самага суровага пралетарскага пакараньня ўсіх удзельнікаў гэтай арганізацыі.

Адказам на спробы падрыву сацыялістычнага будаўніцтва можа быць толькі самая бязьлітасная барацьба супроць падрыўнікаў і ўзмацненьне волі сумленных будаўнікоў, адданых пралетарскай рэвалюцыі.

Адказам на выкарыстоўваньне давер'я Савецкай Улады пад штандарам навуковай працы ў Акадэміі, Вузах і іншых культасьветных установах і эканамічных арганізацыях у контр - рэвалюцыйных мэтах павінна быць бязьлітаснае зьнішчэньне шкоднікаў і згуртаваньне сумленных, адданых справе сацыялістычнага будаўніцтва інжынэрна - тэхнічных і навуковых працаўнікоў навокал вялікіх задач, якія з посьпехам вырашае рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі.

На барацьбу за прамфінплян

Аздараўленьне кіраўніцтва заводу „Пралетары"

Сыгнал „Зьвязды" быў своечасовым і правільным

Аб пастанове бюро Гомельскага гаррайкому КП(б)Б

21-га лютага мы атрымалі адкрыты ліст «трохкутніка» Гомельскага машынабудаўнічага заводу «ПРАЛЕТАРЫ». У лісьце паведамлялася, што з прычыны адсутнасьці сырцу заводу пагражае астаноўка.

Ліст паказаўся нам вельмі падазроным па двух прычынах: папершае, ад яго несла надта казённым аптымізмам («... завод узяў курс на максымальна-магчымае скарыстаньне ўсіх рэзэрваў»; «... шырока разгорнутае на заводзе сацыялістычнае спаборніцтва, энтузіязм рабочых і АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАГА ПЭРСАНАЛУ» і г. д.), падругое, усю віну за невыкананьне прамфінпляну «трохкутнік» звальваў на невыстарчальнасьць забесьпячэньня, тады як паводле вестак рэдакцыі забесьпячэньне мэтапляпрацоўчых прадпрыемстваў сырцом было хоць і напружанае, але не такое кепскае, каб нельга было шляхам унутрызаводзкага манэўраваньня ўнікнуць сур'ёзных цяжкасьцяй.

Мы паслалі нашага спэцыяльнага карэспандэнта на завод і выявілі, што НАШЫ ПАДАЗРЭНЬНІ БЫЛІ ЗУСІМ ГРУНТОЎНЫ. Поўны развал «трохкутніка», страшэнная безгаспадарчасьць, значнае зьніжэньне працдысцыпліны, рвацтва з боку асобных рабочых,—вось што ўбачыў наш супрацоўнік на заводзе «Пралетары» (аб гэтым «Зьвязда» зьмясьціла рад артыкулаў у апошніх нумарох). Кіраўнікі-ж заводу, ВІНАВАТЫЯ ПОЎНАСЬЦЮ Ў ЗРЫВЕ ПРАМФІНПЛЯНУ ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ, пасылаючы свой адкрыты ліст у рэдакцыю, імкнуліся гэтым «САМАЗАСТРАХАВАЦЦА» АД АББІНАВАЧАНЬНЯЎ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

Учора мы атрымалі копію пастановы БЮРО ГОМЕЛЬСКАГА ГАРРАЙКОМУ КП(б)Б аб становішчы на заводзе «Пралетары». Пастанова таксама канстатуе, што адкрыты ліст у рэдакцыю зьявіўся «спробаю да самазастрахаваньня, каб перапажыць адказнасьць за зрыў прамфінпляну на трэст», што «спасыланьне на шырока разгорнутае сацспаборніцтва на заводзе ў той час, калі ёсьць значнае паспабленьне працдысцыпліны, калі больш шая частка камуністых і камсамольцаў ня ўцягнуты ва ўдарныя брыгады, калі дырэктыва ЦК аб адзінаначальні на заводзе не праводзіцца ў жыцьцё», — зьяўляецца «палітычна шкодным казённым аптымізмам» і г. д.

Бюро райкому зрабіла з усяго гэтага рад АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ВЫВАДАЎ. Сваю ранейшую пастанову аб былым дырэктары АЛЬФІРОВІЧЫ (гл. «Зьвязду» ад 2-га сакавіка) райком зьмяніў наступным чынам: «... вынесьці т. Альфіровічу суровую вымову са зьняцьцем з работы дырэктара заводу, забараніўшы яму займаць адказную пасаду на адзін год, аб чым давесьці да ведама ЦК КП(б)Б». Пастаноўлена таксама ТЭРМІНОВА ПЕРААБРАЦЬ БЮРО ПАРТКАЛЕКТЫВУ, БЮРО ЦЭХАВЫХ ПАРТ'ЯЧЭЕК І ЗАЎКОМ. Бюро райкамопу даручана неадкладна заняцца аздараўленьнем і ўзмацненьнем работы ў камсамольскім калектыве.

Канстатуючы са здавальненьнем гэтыя аргывывады, рэдакцыя лічыць патрэбным, каб на заводзе быў таксама распрацаваны РАД КАНКРЭТНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ на барацьбу з недахопамі і хваравітымі зьявішчамі — ЗА ШЫРОКАЕ РАЗГОРТВАНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ І САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, ЗА НЯЎХІЛЬНАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ АБ АДЗІНАНАЧАЛЬЛІ, ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЯЦІГОДНІ Ў ЧАТЫРЫ ГАДЫ.

Адзіны фронт буржуазіі і сац.-фашыстых супроць руху беспрацоўных

Тыдзень назад у Бэрліне адбыўся зьезд усенямецкага аб'яднаньня онтавага і замежнага гандлю. Цэнтральным момантам зьезду была прамова намесьніка старшыні ўсенямецкага саюзу прамысловасьці Фравайна. Яго прамова прадстаўляе сабою заклік да арганізацыі калектыўнай абарончай барацьбы з небясьпекамі, якія пагражаюць капіталістычнаму ражыму.

— Для гэтага,—сказаў ён,—варта спыніць усякую барацьбу паміж рознымі групамі. Каранное палажэньне моманту, —падкрэсьліў Фравайн,—заключаецца ў тым, што прыходзіцца цяпер **абараняць ідэю капіталістычнае гаспадаркі супроць ідэі камуністычнае эканомікі.** Ён заявіў, што, зразумела, спачуванае народным масам і што інтарэсы сапраўднае капіталістычнае гаспадаркі супадаюць «з максымальным добрабытам і рабочых мас». Ён, зразумела, унікнуў гутаркі аб такіх апошніх «дасягненьнях» нямецкіх працоўных мас, як скасаваньне дапамогі школьнікам беспрацоўных сем'яў, паражаніцам, закрыцьцё дамоў, дзе выдаюцца «супы» бяднейшаму насельніцтву і г. д. Унікае Фравайн гаварыць таксама аб грандыёзным **беспрацоўі,** ахапіўшы усе капіталістычныя краі, уключаючы Амэрыку.

Становішча на рынку працы ў Нямеччыне можна назваць катастрафічным. Не гаворачы ўжо аб тым, што армія сем'яў, якія атрымліваюць поўную дапамогу па беспрацоўі, пагражае абярнуцца ў шматмільённую, ёсьць сотні тысяч людзей, якія не атрымліваюць нагул ніякае дапамогі. Да сучаснага моманту людзей, якія ня маюць работы, бадай ужо налічваецца **каля 4 млн.** Сюды трэба прылічыць каля 2 млн. людзей, якія працуюць **няпоўны дзень.** Калі ўключыць сем'і беспрацоўных, то мы прыдзем да выводу, што каля **20 млн. чал. непасрэдна пакутуюць ад беспрацоўя.** Па меншай меры **кожны пяты чалавек зьяўляецца беспрацоўным.** Паводле апошніх статыстычных даных, дзяржаўнага кан'юнктурнага інстытуту, у нямецкай прамысловасьці запята цяпер толькі **тры чвэрткі агульнае колькасьці індустрыяльных рабочых.** У справаздачы падкрэсьліваецца, што па ўсіх прыметах Нямеччына знаходзіцца напярэдадні **далейшага скарачэньня сваёй гаспадарчай дзейнасьці.** Прычыну гэтага трэба шукаць як у чыста ўнутраных гаспадарчых адносінах, так і ў агульнай сусьветнай кан'юнктуры.

Такім чынам, кан'юнктурны інстытут канстатуе, што ў сапраўдную фазу гаспадарчае дэпрэсі Нямеччына ўступае толькі цяпер, калі беспрацоўе ўжо пасьпела дасягнуць грандыёзных разьмераў.

Рэфармісцкі прафсаюзны друк, які ў свой час расьпісваў у ружовых фарбах будучыя вынікі капіталістычнае рацыяналізацыі, вымушан цяпер паведаміць, што **22 проц. рабочых, якія ўваходзяць у рэфармісцкія прафсаюзы, пазбаўлены ўсякае работы, і што 11 проц. працуе паўдня.** Некаторыя галіны прамысловасьці хварэюць такім грандыёзным і хранічным беспрацоўем, што не хапае сродкаў і прыходзіцца выдаваць ім дапамогу ў значна меншых разьмерах, чым гэта прадугледжана законам. Да такіх адносяцца **шкляная, лясная, мэталяапрацоўчая прамысловасьці, гароднічтва, служачыя тэатраў, гандлёвыя служачыя** і г. д. Да канца сьнежня мінулага году ў мэталюргічнай прамысловасьці налічвалася **380 тыс.** беспрацоўных, у лясной—**134 тыс.,** у будаўнічай прамысловасьці—**420 тыс.** і г. д. Рэкордную лічбу даюць некваліфікаваныя рабочыя —**810 тыс. чал.**

Буржуазна-сацыял-фашысцкі фронт зварачаецца да дваякага рэду мер для барацьбы з пагражаючымі вынікамі ўзрастаючага беспрацоўя. Папершае, пад усякімі прычынамі **скарачаюцца сумы, всыгнаваныя на дапамогу беспрацоўным.** Другой мерай зьяўляецца **жорсткая барацьба з кампартыяй** і з рэвалюцыйнай прафсаюзнай апазыцыяй. Даволі паказаць, што, дзякуючы прынятым мерам, лік беспрацоўных, якія не атрымліваюць дапамогі, падняўся з 716 тыс. у сьнежні 1928 году да 1.200 тыс. у сьнежні мінулага году. Для прыдушэньня дзейнасьці кампартыі буржуазія і сацфашыстыя не ганьбуюць пікімі гвалтоўнымі мерамі: арыштоўваюцца дзесяткі камуністычных журналістых, захватваюцца памяшканьні партыі, канфіскуюцца ўсякага роду камуністычныя выданьні і робяцца масавыя вобыскі. Далей праводзіцца «чыстка» прадпрыемстваў і прафсаюзаў ад камуністых.

Асаблівую ўвагу паліцыя зварачае ў апошні час **на работу партыі сярод беспрацоўных.** У правым друку гэтымі днямі расказвалася, што галоўнай мэтай апошняга налёту паліцыі на дом імя Лібкнэхта было жаданьне дастаць **«пляны дэманстрацыйных паходаў»** на 6-га сакавіка.

Л. КАЙТ.

Гарбарні даюць дрэнную прадукцыю

Вось ужо **тры месяцы,** як ударнікі Гомельскай абутковай фабрыкі «Праца» паслалі адкрыты ліст рабочым гарбарні **«Бальшавік»** і ўсіх гарбарань Белскуртрэсту з просьбаю прыняць меры **да зьнішчэньня дрэннай якасьці прадукцыі,** якую выпускаюць гарбарні. **Але да гэтага часу прадукцыя не палепшана.**

Дасылаючы ў рэдакцыю адбітак адкрытага лісту, вытворчая камісія фабрыкі **«Праца»** паведамляе, што, з прычыны дрэннага крою, **40-50 проц. галяніішчаў і цунгаў ідуць у брак.**

Вытворчая камісія просіць рэдакцыю «Зьвязды» патрабаваць ад Белскуртрэсту прыняць усе меры для паляпшэньня якасьці прадукцыі.

Зварачаючы ўвагу Белскуртрэсту на гэты факт, **рэдакцыя просіць тэрміновa паведаміць, якія канкрэтныя мерапрыемствы прыняты для паляпшэньня якасьці прадукцыі.**

Нягрунтоўнае апраўданьне

Дражджавы завод **«Пралетары»** (Менск) выканаў вытворчую праграму за 1-шы квартал на 86,82 проц., **а за люты—толькі на 85 проц.** Заўком гэта тлумачыць тым, што як быццам ня было попыту на дрожджы. Між тым, завод «Чырвоная Зара» ў лютым ня мог задаволіць попыту рынку. Нам здаецца, што прычыны зусім іншыя. Напрыклад: ударныя брыгады ня ведаюць аб сваіх дасягненьнях і недахопах з прычыны таго, што паказальнікі па аддзяленьнях ня вывешваюцца. Гэта не дае магчымасьці наладзіць сацспаборніцтва.

А. М.

Даць палём каменядрабілкі

Чырвонаштандартны завод „Энэргія" выканаў вытворчую праграму **за люты** на 100,6 проц. Выпушчана прадукцыі на 289.000 рубёў замест 287.000 руб., вызначаных плянам. Адстаў завод у адносінах выпуску каменядрабілак—замест 60 шт. выпушчана толькі 51, **г. зн. 87 проц. праграмы.**

Перавыбары сельсаветаў—у цэнтр увагі

Найшырэйшая калектывізацыя сельскае гаспадаркі і ў зьвязку з ёю ліквідацыя кулацтва, як клясы, выклікалі неабходнасьць карэнна перагледзець пытаньне — ці спраўляюцца нашы сельсаветы з тымі новымі задачамі, якія ў даных умовах паўстаюць перад імі?

Задачы гэтыя вялікія і адказныя. Заключаюцца яны ў тым, што сельсаветы павінны стаць сапраўднымі праваднікамі дыктатуры пралетарыяту на вёсцы. Сельсавет павінен быць арганізатарам і кіраўніком бядняцка-серадняцкіх мас, аб'яднаўчым зьвяном бядняцка-серадняцкага блёку у справе наступленьня на кулака, кіраваць сацыялістычным будаўніцтвам на вёсцы.

Роля сельсавету, як палітычнага, так і адміністрацыйна-гаспадарчага кіраўніка вёскі вырасла да вялізарных разьмераў. Тэндэнцыі аб «адміраньні» і непатрэбнасьці сельсаветаў ва ўмовах калектывізацыі сельскае гаспадаркі, атрымалі жорсткі адпор ад партыі і савецкай грамадзкасьці.

Партыя паставіла задачу перабудовы работы сельсаветаў адпаведна іх новым задачам, задачам рэканструкцыйнага пэрыяду.

Гэтаму прызначэньню і не адпавядаюць некаторыя абраныя ў мінулым годзе, у іншай абстаноўцы, сельсаветы. Сродкам перабудовы сельсаветаў, узьняцьця іх клясавай баяздольнасьці зьяўляецца перавыбарная кампанія. Партыя і ўрад далі зусім ясную і выразную устаноўку: «Сельсавет, які не перабудаваў свае работы, сельсавет, які адстаў на чале калгаснага руху, які адстае ад тэмпаў сацыялістычнае перабудовы вёскі, які ня ўмее арганізаваць бядняцка-батрацкія масы—ТАКІ СЕЛЬСАВЕТ ПАВІНЕН ЗАРАЗ-ЖА ПЕРАВЫБІРАЦЦА» (З пастановы прэзыдыуму ЦВК СССР).

ЦК КП(б)Б у адпаведнасьці з гэтымі надзвычай важнымі задачамі своечасова даў рад практычных дырэктыў, якія паказваюць, як трэба падрыхтавацца і весьці ўвесь ход перавыбарчай кампаніі.

Але матар'ялы з месц сыгналізуюць аб тым, што на фронце перавыбарнай кампаніі ёсьць значныя прарывы, а ў паасобных мясцох і правалы.

Уся кампанія разгарнулася недапушчальна марудным тэмпам, у зьвязку з чым, тэрміны, устаноўленыя ўрадам, аказаліся невыстарчальнымі і пленум цэнтр. выб. камісіі прымушаны быў прадоўжыць тэрмін сканчэньня перавыбараў да 1-га красавіка.

Раёны ВІЦЕБСКАЕ акругі павялі работу такім шпаркім тэмпам, што ў пасьпяховасьці яе ніяк нельга быць упэўненым. Некаторыя раёны (Бешанковіцкі, Чашніцкі і Сіроцінскі) скамячылі работу тым, што справаздачную і перавыбарную работу зьмяшалі ў адно. А Віцебскі раён мае намер ў тыднёвы тэрмін правесьці перавыбары па... 22 сельсаветах!

Падрыхтоўчая работа ўсюды праведзена надзвычай слаба.

З групамі беднаты папярэдняй прапрацоўкі па пытаньнях кампаніі і практычных яе момантаў не праведзена (асабліва кепска з гэтым справіліся Ворша, Магілеў, Полацак і Віцебск). У практычным правядзеньні перавыбараў дапушчаны грубыя памылкі. У ЗАСЛАЎСКІМ раёне, Мен. акр., па справаздачы сельсавету даклады рэвізійных камісій зусім адсутнічалі, нават матар'ялы рабочых брыгад не заслухоўваліся. Сьпісы пазбаўленых права голасу не пераглядаліся і позвы на перавыбарныя сходы пасылаліся кулаком і нават нябожчыкам.

Нізавыя прафарганізацыі і камсамольскія ячэйкі амаль ніякага ўдзелу ў кампаніі не прымаюць. У тых мясцох, дзе батрацка-бядняцкія масы не арганізаваны, дзе сустрэлі перавыбарную кампанію без напажнай падрыхтоўкі, кулацтва разгарнула сваю «актыўнасьць», і ў некаторых мясцох — не бяз посьпеху. Так, у ЧАЧЭВІЦКІМ раёне, Магілеўскае акр. і ва ЎШАЦКІМ раёне, Полацкае акругі, кандыдатуры, высунутыя парт'ячэйкамі і беднатой, арганізавана праваліліся, зэмест іх абіраліся кулацкія стаўленікі. Гэта азначае, што ў гэтых мясцох ня здолелі даць кулацкай дзейнасьці належнага адпору. Паводле матар'ялаў ЦВК БССР, на 7-га сакавіка па Беларусі праведзена ўсяго 49 сельсаветаў. Гэта лічба гаворыць аб тым, што месцы яшчэ не разварушыліся і што кампанія праходзіць надзвычай марудна.

Недахопы і памылкі ў перавыбарнай рабоце сыгналізуюць аб неабходнасьці тэрміновага пераключэньня ўсяе ўвагі, усіх сіл на ход перавыбараў. Выніні недапушчальнай нядбайнасьці і злачыннай неахайнасьці ў налічваньні. Яны павінны паслужыць добрым урокам.

Трэба паставіць работу так, каб новаабраныя саветы складаліся з лепшых актывістых з батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас, з перадавых калгаснікаў. І новаабіраемыя саветы павінны быць і будуць органамі пралетарскай дыктатуры на сяле, арганізатарамі і кіраўнікамі перабудовы нашае сельскае гаспадаркі на сацыялістычных пачатках.

„Пяцігодка" на гаворачым экране

Першая савецкая гаворачая кіно-карціна

У той час, як за граніцей, асабліва ў Амэрыцы, гаворачае кіно ўжо атрымала шырокае распаўсюджаньне, у нас гаворачае кіно да самых апошніх месцаў ня выходзіла за межы навукова-тэхнічных лябараторый і кінофабрык. Некалькі месяцаў назад у Ленінградзе адкрыўся першы ў СССР тэатр гаворачага кіно, але пакуль што там паказваліся толькі невялікія ўрыўкі гаворачых кінокарцін, якія прадстаўляюць сабою першыя, вельмі нясьмелыя спробы. Таму выпуск савецкай вялікай гаворачай фільмы «Пяцігодка», паказанай гэтымі днямі ў Маскве на грамадзкім праглядзе, зьяўляецца буйной падзеяй.

Аўтары «Пяцігодкі» паказалі «Пяцігодку» толькі ў самых агульных рысах, паставіўшы сваёй задачай даць гледачу бадзёрую зарадку, узьняць яго на тую хвалю энтузіязму, з якім рабочыя масы выконваюць плян вялікіх работ. У аснову фактычнага боку карціны паложаны прамовы т. т. Рыкава і Куйбышэўскага на 5-м усесаюзным зьезьдзе саветаў. Урыўкі з прамоў ілюструюцца паказам розных бакоў савецкага будаўніцтва ў галіне індустрыялізацыі, калектывізацыі вёскі і культурнай рэвалюцыі. Паводле замыслу аўтараў карціны, самыя ўрыўкі з прамоў павінны былі гаварыць т. т. Рыкаў і Куйбышэўскі. Аднак, па тэхнічных прычынах, пакуль што ўрыўкі з прамоў чытаюцца, і гэта некалькі паслабляе ўражаньне ад фільмы. Вельмі добра зроблены ўступ да карціны. Узятыя з кінохронік моманты пахаваньня Леніна паданы з добраскладзеным музычным і гукавым суправаджэньнем.

Асноўным недахопам краіны зьяўляецца падмерная распыўчатасьць некаторых частак, сёе-тое паказана ў занадта агульных малюнках. Але, ня гледзячы на гэта, кінокарціна «Пяцігодка» сьведчыць аб тым, што савецкае кіно хутка даганяе заграніцу ў галіне надзяленьня «вялікага нямога» дарам выразьлівай рэчы.

ЧОРНАЯ РЭАКЦЫЯ ЎЗМАЦНЯЕ АНТЫСАВЕЦКАЕ ЦКАВАНЬНЕ

ПАГРОЗА ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ ПА АДРАСЕ СССР

ВАРШАВА, 8. Размах, які прыняла антысавецкая кампанія ў Польшчы, занепакоіў колы, каторыя лічаць авантурыстычныя імкненьні паўных пластоў небясьпечнымі для польскае дзяржавы. Лідэр сялянскае партыі Домбскі, выступаючы ў камісіі сойму па замежных справах, заявіў, што «неабходна зьвярнуць увагу на шкоду, якая прыносіцца падбухторваньнем грамадзкае думкі супроць СССР на фоне папскага выступленьня. Гэта стварае ўражаньне падрыхтоўкі крыжовага паходу, які можа быць прэлюдыяй да ўзброеных выступленьняў, што абсалютна недапушчальна».

Эндэкі таксама б'юць трывогу. Іх орган «Газэта Варшавска» проста выказвае небясьпеку, каб «міжнародны капітал не захацеў выграбаць каштаны з агню рукамі Польшчы».

«Кур'ер Паранны» вымушаны з горычу прызнаць, што надзеі на масавае ўцяканьне кулакоў з СССР не апраўдаліся. У сувязі з гэтым газэта паведамляе, што праектуемае наладжваньне канцэнтрацыйных лягераў для ўцекачоў зьявілася зусім ліпшім. Імкненьне польскіх мілітарыстых і духавенства стаць на чале рэлігійнай кампаніі супроць СССР не перашкаджае ім ні на мінуту ў сябе дома ня спыняць ганеньня на праваслаўную царкву. У самы разгар антысавецкае кампаніі дэлегацыя украінскіх дзеячоў вымушана была зьвярнуцца да польскае улады з пратэстам супроць закрыцьця 51 праваслаўнае царквы на так званай Галіцыі. Выяўляецца зараз, што якраз каталіцкае духавенства, якое заклікае ўсе пяруны і маланкі на «бальшавіцкіх бязбожнікаў», вядзе 750 судовых спраў з мэтаю адабраць у праваслаўных яшчэ 750 праваслаўных царквоў у Заходняй Украіне і Беларусі. У сьвятле гэтых фактаў фі- «Рэлігійны паход», паводле адкрытага прызнаньня ўрадовага органу «Газэта польска», можа перайсьці да масы сабель і грохату гарматаў.

ФАШЫСТЫЯ ЗЬБІЛІ КАМДЭ ПУТАТА РОСЯКА

ВАРШАВА, 6. Гэтымі днямі ў прадмесьці Лодзі група агентаў і фашысцкіх дружыньнікаў напала на камдэпутата Росяка. Паваліўшы на зямлю Росяка, дружыньнікі таптали яго ботамі і зьбівалі рэвальвэрамі і палкамі. Зьбіваньне т. Росяка адбывалася на вачох камісара паліцыі.

УВАГА ДА ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

СЬВЕДЧЫЦЬ АБ ГАРАЧАЙ ЛЮБВІ ПРАЦОЎНЫХ СССР ДА СВАЕЙ АРМІІ

Ад Рэвваенсавету Саюзу ССР

У 12-ую гадавіну РСЧА Рэвалюцыйны Ваенны Савет Саюзу атрымаў шматлікія прывітаньні з усіх канцоў нашай вялікай пралетарскай дзяржавы: ад пар тыйных, савецкіх, прафэсыянальных і інш. грамадзкіх арганізацый, ад рабочых, сялян-калгасьнікаў, былых партызан, камсамольцаў, вучняў, піянэраў, ад рэвваенсаветаў акруг і розных вайсковых часьцей.

У дзень гадавіны Чырвонай арміі быў перададзены рад новых самалётаў, пабудаваных на сродкі шматмільённай масы, аб'яднанай у Асоавіяхім і іншыя каштоўныя для нашай магутнасьці падарункі. Такая ўвага да нашай гадавіны сьведчыць яшчэ раз аб гарачай аддаданасьці працоўных СССР сваёй арміі, аб цесным зьнітаваньні насельніцтва з яго вернымі абаронцамі, аб шырокім разуменьні ўсім краем усёй сур'ёзнасьці задач нашай абароны.

Ад імя ўсёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі горача дзякуючы ўсіх адзначыўшых наша сьвята і запэўняю іх, што акружаныя такой сымпатыяй мас нашы ўзброеныя сілы будуць няўхільна ўзмацняцца і апраўдаюць давер'е працоўных.

Наркамваенмор і Старшыня Рэвваенсавету ВАРАШЫЛАЎ.

Пэрспэктывы разьвіцьця паўноч морскага шляху

Ня гледзячы на надзвычай цяжкія ўмовы мораплаваньня па рэках паўночнай Сібіры, Карскім моры і Паўночным Ледавітым акіяне, крузазваротпаўночнага морскага шляху няўхільна расьце. Экспарт нашых тавараў па гэтым шляху дасягнуў у 1929 г. 62 тысяч тон, даўшы павялічэньне супроць мінулага году на 217 проц.; агульны грузазварот па паўночным морскім шляху ўзрос адпаведна на 133 проц. Гэтае пашырэньне грузазвароту адбываецца, галоўным чынам, за кошт асноўнага экспартнага тавару—лесу. Прыкметна таксама прагрэсуе вывяз кансэрваў, скурсырцу, ільну і жмыхоў з Казакстану. Ня трэба забываць, што ўзрастаючы грузазварот паўночнага морскага шляху знаходзіцца ў простай сувязі з разьвіцьцём нявычарпаных прадукцыйных сіл поўначы Сібіры і Урапу. Пяцігодка «Комсевпути» прадугледжвае павялічэньне савецкага грузазвароту на нашых паўночных украінах амаль у 10 раз супроць 1928 году.

Значна пашыраюцца нашыя зьверабойныя промыслы ў Карскім моры. «Комсевернуть» мае магутную зьверабойную шкуну, каманда якое навучаецца замежнымі інструктарамі. Вельмі вялікую паслугу ў пашырэньні зьверабойных апэрацый аказалі нам самалёты. Работы лётніка Б. Г. Чухноўскага і гідраграфа Н. І. Яўгенава на «Красіне» далі дасканалыя вынікі. «Комсевернуть» і надалей будзе шырока карыстацца самалётамі ня толькі для разьведак, але і для арганізацыі экспарту пушніны паветраным шляхам. Гэтым у бягучым годзе займуцца ў выглядзе досьледу тры спэцыяльных самалёты і, у выпадку іх пасьпяховай работы, у 1931 годзе будуць устаноўлены нармальныя рэйсы самалётаў для пастаянных перавозак пушніны.

Грузазварот паўночнага морскага шляху значна ажывіцца і ў сувязі з капітальным будаўніцтвам у лясной, горнай і рыбнай прамысловасьці. Першы буйны лесапільны завод ужо пабудаваны ў 300 кілём. на поўнач ад Туруханску. Зараз будуюцца яшчэ два магутныя заводы, якія павінны быць пушчаны ў ход восеньню. Прыродныя багацьці ракі Курэйкі дазволяць значна пашырыць выпрацоўку графіту, які да гэтага часу зьяўляўся імпартным таварам.

У бягучым годзе «Комсевернуть» прыступае да будаўніцтва двух кансэрваных заводаў.

ЮБІЛЕЙ 12-ГОДЗЬДЗЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І 10-ГОДЗЬДЗЯ ПЕРШАЙ КОННАЙ

23-га лютага г. г. у Крамлі пры ўрачыстай абстаноўцы былі разданы байцом, якія асабліва вызначаліся, ардэны Чырвонага Сьцягу.
На здымку: Вышэйшы камскład, які атрымаў па 3 ордэны Чырвонага Сьцягу

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МОССАВЕТУ, ПРЫСЬВЕЧАНАЕ ЮБІЛЕЮ 12-ГОДЗЬДЗЯ ЧЫРВОНАЕ АРМІІ І 10-ГОД

Нашы прафсаюзы амаль нічога не зрабілі для папулярызацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальлі

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб адзінаначальлі ўносіць поўную выразнасьць у разьмеркаваньне абавязкаў паміж гаспадарнікамі і грамадзкімі арганізацыямі на прадпрыемстве.

За вытворчасьць адказвае адміністратар — дырэктар фабрыкі ці загадчык цэхам. Грамадзкія арганізацыі, на аснове самага шырокага разгорнаньня самакрытыкі і сацыялістычнага спаборніцтва, прыцягваюць усю масу рабочых да кантролю над ажыцьцяўленьнем прамфінпляну, да актыўнага ўдзелу ў зьнішчэньні ўсіх перашкод.

Прарыў на гаспадарчым фронце, які мы мелі ў першым квартале бягучага году на радзе прадпрыемстваў і які яшчэ зараз не ліквідаваны на некаторых з іх, яшчэ больш востра ставіць пытаньне аб необходнасьці выразнага кіраўніцтва з боку адміністрацыі. Кожны цэх павінен мець свой прамфінплян, кожны загадчык цэхам павінен усьвядоміць тую адказнасьць, якую ён нясе за выкананьне прамфінпляну. Прафсаюзы павінны былі растлумачыць шырокім масам рабочых значэньне адзінаначальля ў справе ажыцьцяўленьня прамфінпляну. Перадавыя рабочыя, якія зараз з вялікім энтузіязмам б'юцца за ажыцьцяўленьне пяцігодкі, павінны разумець, што на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце абвостранай клясавай барацьбы, вытворчы вучастак ня менш адказны, чым вайсковы фронт у грамадзянскай вайне. Таму, тыя, каму партыя і рабочая кляса даручылі кіраўніцтва вытворчасьцю, павінны ўладаць выстарчальнай паўнатою ўлады.

Між тым, нашы прафсаюзы да гэтага часу надзвычайна мала зрабілі для растлумачэньня сэнсу пастановы аб адзінаначальлі шырокім масам.

Лепшы доказ таму — тыя шматлікія факты грубога скажэньня сыстэмы адзінаначальля, якія мы выявілі на радзе прадпрыемстваў. ДЗЕ АСАБЛІВА ДРЭННА БЫЛО З ВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНУ.

«Дняпроўскую Мануфактуру» мы занесьлі на чорную дошку за ганебны правал у выкананьні прамфінпляну. І трэба сказаць, што адна з асноўных прычын вельмі кепскай работы фабрыкі, гэта — адсутнасьць адзінаначальля.

Былы дырэктар Кірэеў не адчуваў за сабе абсалютна ніякай адказнасьці. Фабрыка плыла па волі хваляў. Цьвёрдай адміністрацыйнай рукі не адчувалася. Характэрна, што калі да Кірэева прыходзіў рабочы з якой небудзь рвацкаю просьбаю, ён заўсёды адсылаў яго да свайго намесьніка або тэхнічнага кіраўніка.

За дырэктара ў шмат выпадках распараджаўся фабком. Даходзіла да таго, што фабком перакідваў рабочых з аднэй работы на другую.

Таксама безадказна працавалі загадчыкі цэхамі майстры. Рвацтва, выпадкі грубога парушэньня працдысцыпліны, агідныя адносіны да сыравіны, да прадукцыі з боку асобных рабочых, надзвычайная колькасьць браку, прагулы,—усё гэта не сустракала належнага адпору з боку загадчыкаў цэхамі.

На машына-будаўнічым заводзе «Пралетары» ў Гомелі аб адзінаначальлі ніхто нічога ня ведае. Усё прадастаўлена самому сабе. Невыкананьне загадаў адміністрацыі — звычайнае зьявішча. І ні бюро парткалектыву, ні заўком не правялі патрэбнай растлумачальнай работы. Самі кіраўнікі заводу ня ведаюць хто каму павінен падпарадкавацца. Таму, калі тэхнічны дырэктар прыпоў у цэх і зрабіў заўвагу майстру, апошні выгнаў яго з цэху. Такія ўзоры «адзінаначальля», такія адносіны паміж кіраўнікамі вельмі адмоўна адбіваліся на псыхалёгіі рабочых і, як вынік — на заводзе з працдысцыплінаю абстаіць зусім дрэнна.

І па заводзе «Чырвоны Мэталіст» у Віцебску, дзе першы квартал прынёс вялікі прарыў у выкананьні прамфінпляну, пытаньне аб адзінаначальлі толькі гэтымі днямі было пастаўлена ў парадак дня. Сярод адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу панує безадказнасьць, нераспарадчасьць. Прафесыянальныя і партыйныя арганізацыі не перашлі яшчэ на новыя формы працы, якія вызначаны пастановаю ЦК аб адзінаначальлі.

На заводзе «Энэргія», дзе з выкананьнем прамфінпляну ня ўсё добра, адзінаначальле таксама не карыстаецца ўнагаю. Заўкомаўцы адкрыта падрываюць аўтарытэт адміністрацыі. Калі адміністрацыя паставіла супрацаўніка канторы для ўліку рабочых, якія пакідаюць працу да гудка, дык заўкомаўцы не знайшлі лепшай «ацэнкі» гэтага мерапрыемства, як яшчэ з адміністрацыі. Або такі факт: калі заўкому трэба было паслаць у трактарную калёну 5 чалавек, дык старшыня заўкому бяз усякага ўгадненьня з адміністрацыяй вынуў іх з вытворчасьці. Таксама робіць і сакратар парткалектыву. Калі яму трэба паслаць куды чалавека, ён без дазволу адміністрацыі здымае яго з работы. Затое сваіх непасрэдных абавязкаў заўком ня ведае. На запытаньне—ці вядзе ён вучот рабочых з вёскі, старшыня заўкому адказаў — «гэта справа адміністрацыі». Што датычыць рабочых, дык амаль ні адзін з іх незнаёмы з пытаньнем аб адзінаначальлі...

Прарывы на гаспадарчым фронце павінны быць ліквідаваны. Для гэтага патрэбна выразная адказнасьць адміністратараў, павінна быць поўнае разуменьне значэньня пастановы ЦК аб адзінаначальлі ўсімі фабрычна - заводскімі арганізацыямі і кожным рабочым паасобку.

На прафсаюзах ляжыць абавязак неадкладна растлумачыць усёй масе рабочых значэньне адзінаначальля.

П.

Парадак продажу або закладкі 1-й, 2-й і 3-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельгаспадаркі

У дадатак да інструкцыі Наркамфіну СССР ад 2-га лютага Цэнтральная Камісія садзейнічаньня Дзяржкредыту і ашчадпрасе пры ЦВК СССР і Наркамфіне СССР паведамляюць усе камісіі садзейнічаньня і органы Наркамфіну, што дазвол на продаж або заклад 1, 2 і 3-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі камісіі садзейнічаньня выдаюць пры наяўнасьці для трымальнікаў пазык выключных акалічнасьцяй, як: беспрацоўе, доўгая хвароба трымальніка пазыкі і членаў яго сям'і, пажара, пажар і інш. цяжкія акалічнасьці, якія цягнуць значнае пагоршаньне матар'яльнага становішча трымальніка пазыкі. Камісіі садзейнічаньня павінны дасканала і ўсебакова абмеркаваць магчымасьць задаваленьня трымальніка пазыкі за кошт іншых крыніц, у прыватнасьці за кошт ссуды з касы ўзаемадапамогі. Калі патрэба трымальніка пазыкі носіць часовы характар або ступень патрэбы не выклікае необходнасьці для трымальніка пазыкі прадаваць аблігацыі, камісія садзейнічаньня выдае дазвол на заклад аблігацыі і вызначае тэрмін закладу. Тэрмін гэты ня можа быць большым аднаго году. Пры выдачы дазволу на заклад камісія садзейнічаньня атрымлівае ад трымальніка пазыкі пісьмовае даручэньне праўленьню свайго калгасу рабіць утрыманьні з іх заработку для паступовага пагашэньня ссуды.

Беспрацоўныя пры атрыманьні ссуды выдае крэдытнай установе падпіску ў тым, што ён абавязуецца, пасьля паступленьня на работу неадкладна паведаміць месца свае работы і аплаціць ссуду ва ўстаноўлены тэрмін. Пры атрыманьні ссуды пад заклад аблігацый трымальнікі пазык — сяляне (ня члены калгасу) і неарганізаванае насельніцтва — выдаюць крэдытнай установе або ашчадкасе падпіску ў тым, што яны абавязуюцца аплаціць ссуду ў працягу таго тэрміну, які ўстаноўлены камісіяй садзейнічаньня. Калі часовая патрэба трымальніка пазыкі становіцца доўгай, камісія садзейнічаньня мае права або прадоўжыць тэрмін ссуды, або замяніць дазвол на заклад — дазволам на продаж аблігацый.

Дазволы на продаж або заклад аблігацый пазык, якія павінны быць абмены, выдаюцца рабочым і служачым — камісіямі садзейнічаньня пры прадпрыемствах, установах і арганізацыях, беспрацоўным — камісіямі садзейнічаньня на месцы іх апошняй работы, калі ад моманту звальненьня з работы прайшло ня больш трох месяцаў, ва ўсіх іншых выпадках беспрацоўныя атрымліваюць дазвол ад камісій садзейнічаньня пры гарсаветах (райсаветах) па месцы пражываньня беспрацоўнага; саматужнікам і іншаму (неарганізаванаму) гарадзкому насельніцтву — камісіямі садзейнічаньня пры гарадзкім і раённых саветах па месцы пражываньня трымальніка пазык; насельніцтву, якое пражывае ў сельскіх мясцовасьцях — камісіямі садзейнічаньня пры сельсаветах па месцы пражываньня трымальніка пазыкі. Трымальнікі пазык з неарганізаванага гарадзкога насельніцтва павінны пры заявах падаваць камісіі садзейнічаньня справкі, якія пацьвярджаюць акалічнасьці, каторыя выклікалі необходнасьць для трымальнікаў пазык прадаць або заставіць аблігацыі. Такімі справкамі могуць быць справкі, выданыя жыларганізацыямі аб матар'яльным становішчы і ступені патрэбнасьці трымальнікаў пазык у даны момант, справкі біржы працы аб беспрацоўі і інш.

Утрыманцы вышэйпамянёных трымальнікаў пазык атрымліваюць дазвол на заклад або продаж аблігацый у тымжа парадку, што і асобы, на чым утрыманьні яны знаходзяцца. Камісіі садзейнічаньня павінны забясьпечыць магчымасьць найлутчэйшага разгляду паступаючых ад трымальнікаў заяў.

Камісіі садзейнічаньня пры прадпрыемствах і установах павінны наладжваць пасяджэньні ня менш аднаго разу ў пяць дзён. У выпадку накапленьня заяў наладжваецца па-зачарговае пасяджэньне. Продаж або заклад аблігацый робіцца толькі ў тэй крэдытнай установе або ашчадкасе, якія паказаны ў дазволе камісіі садзейнічаньня. У выпадку нязгоды з дазволам камісіі пры прадпрыемстве і ўстанове, трымальнік пазыкі можа абскардзіць гэту пастанову перад фабзаўмясцкомам. Пастановы камісіі садзейнічаньня пры сельсаветах могуць быць абскаржаны перад сельсаветамі. Пастановы фабзаўмясцкомаў і сельсаветаў зьяўляюцца канчатковымі і далейшаму абскарджаньню не падлягаюць. Таксама зьяўляюцца канчатковымі і пастановы, якія прымаюцца па заявах трымальнікаў пазык, камісіямі пры гарсаветах і райсаветах.

З прычыны асабліва сур'ёзнага і важнага значэньня ўскладаемай на камісіі садзейнічаньня работы па выдачы дазволаў трымальнікам пазык, павінен быць устаноўлен сапраўдны нагляд і сыстэматычны кантроль за гэтай работай з боку вышэйшых камісій садзейнічаньня. Камісіі садзейнічаньня пры тых калектывах рабочых і служачых, а таксама пры тых сельсаветах, пры чаньня. Арганізацыя камісій садзейнічаньня пры паказаных калектывах і сельсаветах павінна быць скончана не пазьней 15-га сакавіка.

ПЯЦІГОДКУ — Ў ЧАТЫРЫ ГАДЫ



У сяле Іванцеяўка (Маскоўская вобласьць) скончана пабудова прадзільнай фабрыкі на 156,516 верацён. Кошт фабрыкі — 13.710 тысяч руб.

Сусьветны эканамічны крызіс, забастовачная барацьба і беспрацоўе

З ДАКЛАДУ тав. Д. З. МАНУІЛЬСКАГА НА ПАШЫРАНЫМ ПРЭЗЫДЫУМЕ ВККІ

Некаторыя папярэднія вынікі

Пасьпяваньне сусьветнага эканамічнага крызісу цяпер—бясспрэчны факт. Калі месяцы паўтара таму назад у буржуазна-эканамічным друку яшчэ выказваліся сумненьні, ці перапаўне крызіс з ПАЗШ на іншыя краі, калі недаацэнка значэньня амэрыканскага крызісу знаходзіла яшчэ нядаўна адбітак таксама і ў камуністычным друку, у прыватнасьці, і ў нашым краі пралетарскай дыктатуры, сярод савецкіх эканамістаў (Паўлаў), то сёньня пасьпяваньне эканамічнага крызісу бясспрэчнае. Можна мець розныя думкі аб тэмпе, аб ступені, аб формах нарастаньня сусьветнага крызісу, але нельга адмаўляць фактаў.

Зазначаючы далей, што крызіс цягне за сабою вялізарнейшыя сацыяльна-палітычныя вынікі, дакладчык падводзіць некаторыя палітычныя падагуленьні эканамічнага крызісу, які ўжо пачаўся. У асноўным яны зводзяцца да наступнага. Першы вывад: абанкрутавала тэорыя амэрыканскага «проспэрыці» («бляргополучия»), якая ляжала ў аснове ўсіх пасьляваенных буржуазных тэорый аб вечнасьці і непахіснасьці капіталістычнага ладу, аб узрастаючай плянавасьці капіталістычнай гаспадаркі, пе арганізаванасьці і эдольнасьці перамагаць элементы анархіі, улаўшчыя нібы толькі капіталістычнаму грамадзтву раньняга пэрыяду, набудаванаму на пачатках свабоднай канкурэнцыі. Разам з тым пацярпела крушэньне і тэорыя бяскрызіснай гаспадаркі.

Другі вывад. Збанкрутавала тэорыя амэрыканскай выключнасьці Ляўстона-Пэнэра, якая зьяўляецца толькі розна-віднасьцю тэорыі амэрыканскага «проспэрыці».

Трэці вывад. Крызіс падагульвае таксама вынік сацыял-дэмакратычнай тэорыі «арганізаванага капіталізму» (тэорыя ультра-імпэрыялізму Каўцкага, «арганізаванага капіталізму» Гільфэрдынга—тэорыя, якая бачыць у міжнародным перапляценьні эканамічных інтарэсаў фактар, што зьнішчае капіталістычныя супярэчнасьці і, нарэшце, апошняму выданьню гэтай тэорыі—аб ураўнаньні кан'юнктуры, тэорыі, якая абараняецца Нафталі і стала зараз афіцыйнай праграмай АДГБ).

Чацьверты. Крызіс падагульвае вынікі нашай дыскусіі па пытаньні аб «арганізаваным капіталізьме» таксама з бухарынскай школай, якая прабавала працягнуць у рады Камінтэрну погляды, нібы ў цяперашнюю імпэрыялістычную эпоху «праблемы рынку, цэн, канкурэнцыі, крызісаў становяцца ўсё больш праблемамі сусьветнай гаспадаркі, замяняючыся ўнутры краіны праблемай арганізацыі». Амэрыканскі крызіс паказаў навочна, што «праблемы рынку, цэн, канкурэнцыі, крызісаў, становячыся ўсё больш праблемамі сусьветнае гаспадаркі, нараджаюць у той-жа час у кожнай асобнай капіталістычнай краіне кайглыбейшыя ўнутраныя супярэчнасьці, нарастаючыя роўнаежна і ў пастаянным ўзаемадзеяньні з супярэчнасьцямі знадворнымі.

Пяты. Крызіс падагульвае вынік нашай барацьбы з правымі і прымірэнцамі па пытаньні аб характары трэцяга перыяду.

Шосты. Пасьпяваньне крызісу пацьвярджае правільнасьць поглядаў Камінтэрну ў пытаньні аб капіталістычнай рацыяналізацыі і яе выніках.

Сёмы. Крызіс падагульвае вынік таксама зусім фальшывай тэорыі дэкалёнізацыі.

Нарэшце, пасьпяваючы сусьветны крызіс у капіталістычных краінах пры пераможным ажыцьцяўленьні пяцігадовага пляну ў СССР падводзіць баланс сусьветна-гістарычнага значэньня. Дзьве сусьветныя сыстэмы стыкнуліся паміж сабою: сыстэма амэрыканскага капіталістычнага «проспэрыці» і наш пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва.

Трэба бачыць трывогу ўсяго капіталістычнага сьвету перад нашым пяцігадовым плянам і калектывізацыяй, каб ацаніць іх сапраўды сусьветна-гістарычнае значэньне. Небясьпека нападу на СССР з боку імпэрыялістых навялічвае фронт напыраецца, у ім адну з кіраўнікоў. І чым больш будзе хістацца становішча амэрыканскага капіталізму, чым больш актыўнай будзе станавіцца антысавецкая палітыка амэрыканскай буржуазіі.

Вынікі крызісу і задачы кампартыі

Я пераходжу, таварышы, да апошняй часьці дакладу аб выніках гэтага крызісу і аб задачах, якія паўстаюць перад сэкцыямі КІ ў сувязі з крызісам. Крызіс азначае сабою пачатак развалу капіталістычнай стабілізацыі. Не надышоўшы ўжо клясц капіталістычнай стабілізацыі, а толькі пачатак развалу яе, бо развал капіталістычнай стабілізацыі азначае-бы развал капіталістычнай сыстэмы, г. зн. стварэньне ў капіталістычных краінах аб'ектыўна рэвалюцыйнай сытуацыі. Гэта азначала-б, што ўся палітычная надбудова, якая вырасла на аснове пасьляваеннай адноснай стабілізацыі капіталізму, уся сыстэма між народных адносін, што склалася ў выніку сусьветнай вайны 1914—18 г.г., Вэрсальскі, плянаў Дауэса і Юнга, уся сыстэма клясавых адносін, адносін з калёніямі, адносін капіталістычнага сьвету з СССР была-б ня толькі пахістана, але і разбурана рэвалюцыйным рухам працоўных мас.

Тэмп і характар развалу капіталістычнай стабілізацыі залежаць ад цэлага раду фактараў: ад працяжнасьці і глыбіні цяперашняга крызісу, ад таго, наколькі ён у сваю чаргу паглыбіць агульны крызіс капіталізму ад патрасеньняў, якія пацягне за сабою далейшае абвастрэньне супярэчнасьцяй на міжнароднай арэне, нарэшце, ад тэмпу нарастаньня рэвалюцыйнай актыўнасьці мас. Як рэвалюцыйныя палітыкі, як ленінцы-маркісты, мы ня можам нашу агульную пэрспэктыву рэвалюцыйнага разьвіцьця, якое паскараецца сусьветным эканамічным крызісам, прымаць за факт, які ўжо адбыўся, і на ім будаваць нашы тактычныя вывады.

Калі ўзяць вынікі крызісу ў вялікім гістарычным разрэзе, дык ня можа быць сумненьня ў тым, што крызіс у вялікай ступені абвастрае ўсе тыя асноўныя супярэчнасьці, якія былі вызначаны X пленумам ВККІ, узмацняючы і ствараючы новыя фактары разбурэньня капіталістычнай стабілізацыі.

Да катэгорыі такіх фактараў адносіцца ў першую чаргу агрэсыўнасьць Паўн.-Амэр. Злучаных Штатаў. Формы гэтай агрэсыўнасьці Амэрыкі будуць розныя. Папершае, формы эканамічныя. Да гэтага часу Амэрыка з агульнай свайй прадукцыі вывозіла мала—усяго каля 8 проц. Павялічэньне амэрыканскага вывазу тавараў усяго на некалькі процантаў пры вялізарным вытворчым размаху П.-А.З.Ш. пагражае літаральна катастрофай для яе канкурэнтаў на сусьветных рынках.

Тэй-жа мэце паслабленьня канкурэнтаў будзе служыць у руках П.-А.З.Ш. і экспарт капіталу.

Амэрыканскі капітал будзе хутка заваёўваць кіраўнічыя пазыцыі на сусьветнай арэне, у новых квітнеючых галінах прамысловасьці—электрычнай, хэмічнай, аўтамабільнай і г. д. Але апрача эканамічных форм націску, агрэсыўнасьць П.-А.З.Ш. будзе усё больш і больш вылівацца ў формы ваенна-палітычныя.

Сусьветны крызіс, які ўсё разгортваецца, паскарае ў вялізарнай ступені высьпяваньне імпэрыялістычнай вайны паміж Англіяй і ПАЗШ.

Крызіс паглыбіць яшчэ больш супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі лягерам, з аднаго боку, і калёніямі і эканамічна і палітычна слабымі і залежнымі дзяржавамі—з другога. Выпаўзьці з крызісу буржуазія будзе прабаваць у першую чаргу за кошт пралетарыяту, але разам з тым за кошт калёній і залежных і паўзалежных дзяржаў. А гэта адкрые палазу яшчэ большага, адкрытага грабежніцтва калёній, іх дзяльбы пры дапамозе зброі, яшчэ больш шырокага дастасаваньня мэтадаў ваенная акупацыі. Эканамічнае паслабленьне Кітаю, з прычыны крызісу, паставіць на парадак дня перад імпэрыялістымі пытаньне аб яго падзеле. Паўднёвая Амэрыка ўвойдзе ў яшчэ больш вострую фазу войнаў грамадзянскіх і войнаў паасобных дзяржаў праз падстаўныя агентуры амэрыканскага і ангельскага капіталу. У адказ на гэты жахлівы імпэрыялістычны ўціск пракоціцца па калёніяльным сьвеце новая хваля паўстаньняў, якая пакідае далёка ззаду ўсё тое, чаму мы зьяўляліся сьведкамі за апошні час. У той-жа час крызіс узмоцніць цэнтрабежныя тэндэнцыі ангельскіх дамініёнаў, паскорыць працэс іх аддаляньня ад Вялікабрытаніі, а, значыць, і эканамічны і палітычны распад Вялікабрытанскай імпэрыі, набудаванай на прынучаньні працоўнага насельніцтва вялізарнай часьці земнае кулі.

У галіне ўнутраных адносін у капіталістычных краінах крызіс нясе з сабою новую хвалю канцэнтрацыі капіталу, разбурэньня дробнай і сярэдняй буржуазіі, падрыву сацыяльнага базісу рабочай арыстакратыі і, у моц гэтага, абвастрэньня сацыяльных супярэчнасьцяй. А гэта ў цяперашній абстаноўцы няўхільна павядзе да росту фашызму, паскорыць і паглыбіць працесы далейшай фашызацыі сацыял-дэмакратыі і прафсаюзнай рэфармісцкай бюракратыі, ператвараючы іх з партыі «капіталістычнай стабілізацыі» ў партыю абароны капіталізму, які здыхае і разбураецца. У той-жа час гэта адкрывае і вялізарнейшыя пэрспэктывы перарастаньня цяперашняга рэвалюцыйнага ўздыму ў рэвалюцыйную сытуацыю ў перадавых капіталістычных краёх і калёніях. Такавы вынікі крызісу ў іх вялікім гістарычным разрэзе, разьлічаным на рад год, якія аддзяляць нас ад апошніх рашаючых баёў за пралетарскую дыктатуру.

Але, таварышы, задачы гэтага прэзыдыуму заключацца ня ў тым, каб вызначыць к...пу стратэгічную ўстаноўку на рад год,—гэта ўстаноўка дана ў дакумантах VI кангрэсу і X пленуму,—а ў тым, каб у гэты гістарычны дзень вызначыць нашу тактычную лінію на бліжэйшыя тры-чатыры месяцы. І першае пытаньне, якое паўстае перад намі ў сувязі з вынікамі гэтага крызісу, эволюцыя да таго, які будзе ўплыў крызісу на нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму сусьветнага рабочага руху ў бліжэйшыя тры-чатыры месяцы.

Што повага здарылася з часу X пленуму, што дазваляе нам сказаць, што насьпяваючы рэвалюцыйны ўздым узьняўся яшчэ на адну ступень вышэй? Папершае, антыпаесная барацьба пралетарыяту і жніўня. Зусім ясна, што, калі-б у нас ня было рэвалюцыйнага ўздыму, нам і жніўня не ўдалося-б правесьці. Мы-ж будавалі гэты рух не на стыхійнай хвалі, а выключна на аснове арганізацыйнага ўплыву кампартый на масы, г. зн. камуністыя ішлі не па лініі найменшага супраціўленьня, а па лініі найбольш цяжкой, бо наш арганізацыйны ўплыў зьяўляецца якраз ахілесавай пятой у нашай рабоце. І тым ня менш, нам удалося ўцягнуць у гэты рух у дзесяць раз больш рабочых, чым налічваюць сакцыі КІ, дык гэты факт зьяўляецца найбольш пераканальным довадам рэвалюцыйнага ўздыму. Прадстаўнікі розных кампартый, асабліва кампартый нелегальных—італьянскай і румынскай і інш—ведаюць, што і жніўня было пераломным момантам у рабочым руху ў цэлым радзе краін, асабліва ў краінах белага тэрору і фашысцкай дыктатуры.

Другім момантам, які сьведчыць аб далейшым насьпяваньні рэвалюцыйнага ўздыму зьяўляецца нават ня столькі самы забастовачны рух, колькі тыя буржуазныя формы, у якія ён выліваецца. Мы бачым у радзе капіталістычных краёў, пасьля X пленуму, далейшае ўзмацненьне забастовачнай хвалі.

Характэрнай рысай цяперашняга забастовачнага руху зьяўляецца, далей, тое, што ён усё часьцей суправаджаецца вулічнымі дэманстрацыямі, сутычкамі з паліцыяй, жандармэрыяй, войскамі, штрэйкбрэхэрскімі дружынамі, сацыял - фашыскімі шпёнамі. Гэтым самым рабочыя ўсё больш і больш падводзяцца да стварэньня неабходнасьці злучэньня эканамічнай барацьбы з палітычнай.

Новым пасьля X пленуму зьяўляецца факт прарыву рабочым рухам рамак фашысцкай дыктатуры ў радзе краін белага тэрору. Ці можна адмаўляць, што адкрытыя выступленьні рабочых у Італіі, у Румыніі, якія адбываліся там упяршыню за рад год самай нястрымнай фашысцкай рэакцыі, адбілі сабою нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму?

Трэцяе праўленьне рэвалюцыйнага ўздыму—гэта рух беспрацоўных. Мы яго ня мелі да моманту X пленуму ні ў такіх разьмерах, ні ў такой форме. Зараз ва ўсім сьвеце каля 17 мільёнаў пралетараў прызначаны капіталістычным грамадзтвам на голад і галечу. Гэта маса ня хоча пакорліва паміраць. Яна заяўляе ад сабе бурнымі дэманстрацыямі, прад'яўляючы да парлямантаў і муніцыпалітэтаў патрабаваньні «хлеба і работы». Гэта маса прадана рэфармісцкімі прафсаюзамі, «рабочымі» міністрамі, сацыял-дэмакратычнай партыяй. Сацыял-фашысцкая сволач усяк імкнецца аддучыць рух рабочае клясы ад руху беспрацоўных, каб на адным разьбіць паасобныя атрады рабочае клясы. Значэньне руху беспрацоўных у цяперашніх мовах крызісу надавычайна вялікае. Яно рэвалюцыянізуе ўсю клясавую барацьбу пралетарыяту, наглядна выкрываючы сутнасьць буржуазнай фашысцкай палітыкі ўраду сад.-дэм. Мюлера ў Нямеччыне і Макданальда—Томаса ў Англіі.

Міжнароднае значэньне руху беспрацоўных улічылі эўрапэйскія кампартыі, якія назначылі на 6-га сакавіка міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем. Трэба, каб 6-га сакавіка ня было днёмізаляванага руху беспрацоўных, а зьявілася днём барацьбы ўсяе міжнароднае рабочае клясы супроць спроб буржуазіі пераладжыць на яе ўсе вынікі насьпяваючага сусьветнага эканамічнага крызісу.

Нарэшце, чацьвертай формай праяўленьня рэвалюцыйнага ўздыму зьяўляецца факт распачатага пад уплывам сусьветнага аграрнага крызісу ўпяненьня сялянскіх рэзэрваў у рэвалюцыйны рух як у капіталістычных краінах, так і асабліва ў калёніях. Гэта таксама тое новае, няхай яшчэ і слаба выяўленае, што трэба адзначаць пасьля X пленуму для характарыстыкі цяперашняй стадыі рэвалюцыйнага ўздыму. Мы наглядалі за апошні час сялянскія выступленьні ў Грэцыі, на высьне Крыцце, хваляваньні сярод сялян у сувязі з непамерна вялікім падатковым цяжарам у Польшчы, на поўдні Італіі. Мы бачым разварушваньне сялянскіх мас, якое пачынаецца ў Індыі: сымптомамі яго служаць рух сікхаў (былых салдат), якія патрабуюць зямлі, і сялянская канфэрэнцыя ў Пэнджабе, дзе прысутнічала каля 25.000 сялян. Мы бачылі, далей, у сувязі з аграрным крызісам хвалю тубыльных паўстаньняў у Гаіці, Ніжняй Нігерыі і іншых калёніях. Нарэшце, з моманту X пленуму мы прысутнічаем пры развале нанкінскай рэакцыі, пры новым выбуху міжусобнай генаральскай вайны ў Кітаі, якая стварыла спрыяючую абстаноўку для новага ўздыму рэвалюцыйнай хвалі ў Кітаі.

БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНЫ КАДРЫ КВАЛІФІКАВАНЫХ САДАВОДАЎ, ГАРОДНІКАЎ І ПЧАЛЯРОЎ

(У парадку абгаварэньня)

Спрыяючыя кліматычныя і глебавыя ўмовы даюць магчымасьць з посьпехам разьвіваць садоўніцтва ў Беларусі, дзякуючы чаму яно тут амаль усюды набыло прамысловы характар, завалёўваючы рынак.

Кожны год з Беларусі вывозіцца па некалькі тысяч вагонаў фруктаў, асабліва з акруг Магілеўскай, Гомельскай і Бабруйскай. Магілеўская антонаўка вядома ня толькі ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве і іншых савецкіх гарадох, а і на замежных рынках Кенігсбэргу, Данцыгу і інших.

Пэрспэктыўнымі плянамі вызначаецца значнае пашырэньне садовае плошчы на Беларусі. Гэтае пашырэньне пойдзе шляхам закладкі ў прыгарадных калгасах і саўгасах буйных прамысловых садоў з ягаднымі плянтацыямі.

Адначасова мяркуецца адкрыць цалы рад перапрацоўчаных заводаў з мэтай скарыстаньня другарадных фруктаў і ягад на віно, павідла, пюрэ, пасьцілу і іншае. Гэта дасьць яшчэ больш штурмшок да разьвіцьця садоўніцтва на Беларусі, надаючы яму ўсё больш прамысловы характар.

ПЭРСПЭКТЫВЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ ГАРОДНІЦТВА

Рост гарадзкое прамысловасьці, а разам з гэтым рост рабочага насельніцтва гораду павялічвае попыт на гародніну, якое ў нас у цяперашні час мала.

Для здавальненьня гарадоў Беларусі, ня лічачы вясковага насельніцтва, патрэбна каля 70.000 тон рознай гародніны.

Таму перад зямельнымі органамі і Белсадсаюзам стаіць вострае пытаньне аб хутчэйшым пашырэньні плошчы прамысловых гародаў, як шляхам закладкі буйных гародных масываў у прыгарадных калгасах і саўгасах, так і шляхам стварэньня спэцыяльных гародных калгасаў, блізка ад рынку, чыгуначных і водных шляхоў.

Адзін такі буйны масыў, плошчаю каля 1.000 гэктар., запраектаваны ў Магілеўскай акрузе, ва ўрочышчы «Давыдаўка» на Лепалаве, дзе мяркуецца арганізаваць чырвонаармейскі гародны калгас.

ЗНАЧЭНЬНЕ ПЧАЛЯРСТВА

Яшчэ з даўных гадоў Беларусь славілася мёдам і воскам, якія ў вялікай колькасьці вывозіліся за межы, як каштоўны тавар.

Лясы і сенажаці, пакрытыя квітнеючай расьлінай, палі, засяваныя грэчкай, мякці і вадкі клімат—спрыяюць разьвіцьцю пчалярства.

Паводле прыблізнага падліку па БССР ёсьць 200.000 раёў пчол а прадукцыя мёду каля 3.000 тон.

Прыгарадныя пасьбавыя ўмовы, пашырэньне плошчы корма-мёданосных траў даюць магчымасьць павялічыць колькасьць раёў пчол у БССР да 300.000 а прадукцыяй каля 50.000 тон мёду.

Трэба адзначыць, што пчалярства не патрабуе вялікіх выдаткаў, хутка зварачае ўкладзены ў яго капітал і дае вялікі прыбытак, узмацняючы гэтым самым наогул усю гаспадарку.

Таму амаль што ўсе калгасы і саўгасы, асабліва Магілеўшчыны, зацікаўлены ў пчалярстве і арганізуюць у сябе прамысловыя пасекі. Далейшае павіннае ісьці выключна шляхам арганізацыі таварных пасек у калгасах і саўгасах, а таксама шляхам стварэньня спэцыяльных пчалярных вытворчых арцеляй, дзе для гэтага ёсьць спрыяючыя ўмовы.

ПАТРЭБНЫ КАДРЫ САДАВОДАЎ, ГАРОДНІКАЎ І ПЧАЛЯРОЎ

Для выкананьня вызначаных плянаў па разьвіцьці садоўніцтва, гародніцтва і пчалярства ў БССР патрэбны кадры кваліфікаваных работнікаў, якіх у нас амаль што зусім няма. Асабліва востры недахват у спэцыялістых гэтых галін сельскае гаспадаркі адчуваецца ў радах суцэльнай калектывізацыі, дзе індывідуальныя сялянскія сады, пасекі і гароды, уліваючыся ў сацыялістычны сэктар, патрабуюць рэарганізацыі, пляніраваньня і інструктаваньня.

Калектывізаваная Магілеўшчына будзе мець да канца 1930 году каля 100 калгасаў з садамі і гародамі і каля трох сот калгасных таварных пасек з 200 раямі пчол кожная.

Амаль што ў такім-жа становішчы будуць знаходзіцца і іншыя акругі, стваючы ў сябе суцэльную калектывізацыю.

Паводле прыблізных падлікаў на ўсю БССР патрэбна будзе каля 2.500 садаводаў і каля 1.200 пчаляроў. У цяперашні час гэтае кваліфікаванае сілы не хапае для замяшчэньня пасад акруговых інструктароў.

Гэтае палажэньне патрабуе хутчэйшага разьвязаньня пытаньня аб адкрыцьці ў БССР садова-гародна-пчалярнага інстытуту з тым, каб да канца пяцігодзьдзя падрыхтаваць хоць частку патрэбнае кваліфікаванае сілы.

ДЗЕ ПАВІНЕН БЫЦЬ АДКРЫТЫ ІНСТЫТУТ?

Найлепшым месцам для адкрыцьця садова-гародна-пчалярнага інстытуту зьяўляецца Магілеўская акруга, як цэнтр садоўніцтва, гародніцтва і пчалярства БССР і як цэнтр суцэльнае калектывізацыі сельскае гаспадаркі Беларусі.

У прыватнасьці гэты інстытут павінен быць у першай усебеларускай дзіцячай камуне, якая павінна рэарганізавацца, з прычыны значнага памяншэньня на Беларусі бясспрытульных дзяцей.

Наяўнасьць багатых добраякасных будынкаў, выстарчальная плошча зямлі (160 гэкт.) з лёсавымі сутлінкамі, вельмі спрыяючымі для садоўніцтва, наяўнасьць пладовага саду (16 гэктар.) з багатым асартымэнтам плядоў, вялікі, каля 15 гэктар, пладовы выхавальнік, буйныя прамысловыя гароды (гарод «Гігант» па Лупалаве, плошчай у 1.000 гэктараў), блізкасьць адзінай у СССР станцыі лекавых расьлін, наяўнасьць у г. Магілеве добра абсталяванай навучальна-паказальнае пасекі, якая можа быць хутка рэарганізавана ў дасьледчую станцыю пчалярства; плянтацыі хмельніка і іншыя спрыяючыя ўмовы кажуць пра тое, што гэты інстытут павінен быць тут.

Хаця ў Беларусі існуе Мар'іна-Горскі садова-гародны тэхнікум, але-ж ён адкрыты ў стары час абшарнікам у сваім абшары для эксплёатацыі вучняў. Алкрыцьцё яго насіла выпадковы характар і таму зусім не прыстасавана да глебавых і іншых умоў. Акружаюць гэты тэхнікум пяскі, зусім няпрыгодныя для садоўніцтва, гародніцтва і ягадных культур.

Апрача таго існуе Беларуская сельска-гаспадарчая акадэмія, якая, побач з паляводамі, жывёлаводамі, лесаводамі і інш., выпускае і садаводаў, але-ж вельмі нязначную колькасьць. Трэба адзначыць, што універсальныя ВНУ ня могуць даць тэй сталай падрыхтоўкі па тэй або іншай галіне, якую можа даць спэцыяльная ВНУ, знаходзячыся ў спрыяючых дзеля гэтага ўмовах, як напрыклад, Магілеўшчына для садова-гародна-пчалярскага інстытуту.

Ні РСФСР, ні УССР, ні Сібір не прадстаўляюць саб

Гаспадарнікі затрымліваюць аграномаў

У радзе ўстаноў мабілізавана ў калгасы толькі 30-40 проц. спэцыялістых

Наркамзем БССР падагуліў канчатковыя вынікі мабілізацыі агра-спэцыялістых Беларусі на работу ў калгасы. Усяго на БССР мабілізаваны 261 спэцыяліст і каля 30 спэцыялістых замацавана для работы ў калгасах з ліку тых, якія былі пасланы ў вёску раней.

Па Менску мабілізавана з цэнтральных устаноў 75 чал. і акруговых устаноў — 20. Акрамя гэтага 26 спэцыялістых навукова - дасьледчага інстытуту імя Леніна, якія былі пасланы ў калгасы раней, замацаваны за калгасамі да 1-га мая.

Трэба, аднак, адзначыць, што мабілізацыя агра - спэцыялістых прайшла ня вусім здавальняюча. Мабілізавана значна менш, чым 90 проц., вызначаных пастановаю СНК СССР. У радзе ўстаноў мабілізацыя **захапіла толькі 30-40 проц. спэцыялістых.**

Ня гледячы на тое, што на агульнагарадзкім сходзе ўсе спэцыялістыя гор. Менску абвясьцілі сябе мабілізаванымі і выказалі гатоўнасьць выехаць на работу ў калгасы, значная колькасьць іх усё-ж засталася ў апаратах. Гаспадарнікі ўпарта не адпускаюць іх у калгасы. У Белкалгасцэнтры з **12 спэцыялістых пакуль што выехалі ў калгасы 6 чал.** Рэшту спэцыялістых гаспадарнікі Белкалгасцэнтру не адпускаюць. З 14 спэцыялістых Белпаляводсаюзу мабілізавана на работу ў калгасы 6 чал., з 11 спэцыялістых Белмалжывсаюзу мабілізавана 5 чал. і г. д.

Па акругах БССР мабілізацыя прайшла таксама ня ўсюды здавальняюча. Магілеўская акруга, як акруга суцэльнае калектывізацыі, павінна была асабліва актыўна правесьці кампанію па мабілізацыі. Аднак, у Магілеве мабілізавана 15 спэцыялістых. Ні ў якім разе нельга лічыць, што гэта складае 90 процантаў усіх спэцыялістых Магілева.

Полацкая акруга дала 11 агра-спэцыялістых, Віцебская — 31, Мазырская — 21, Бабруйская — 22 спэцыялістых. Ворша — 29, Гомель — 35.

З усіх акруг паведамляюць, што мабілізаваныя ўжо выехалі на месцы.

С. Г.

Гаручае для трактарных калён

Паводле прапановы Нафтасындыкату, спажывецкая кааперацыя будзе задавальняць трактарныя калёны неабходным гаручым матар'ялам. Зараз на Беларусі ёсьць усяго 20 баз для гаручага матар'ялу, што зьяўляецца невыстарчальным. Белкаапсаюз прыступае да пабудовы 13 новых баз. Ужо закуплены бакі, і адданы загад заводу «Энэргія» і гомельскім чыгуначным майстэрням на пабудову патрэбных сховаў для баз гаручага пры трактарных калёнах.

Забесьпячэньне саўгасаў і калгасаў спэцзопраткай і прамтаварамі

Белкаапсаюзам на працягу другога кварталу спэцыяльна адгружаецца для забесьпячэньня калгасаў і саўгасаў 7 вагонаў баваўнянай тканіны, на 50.000 руб. суконна - баваўняных тавараў, гатовае вопраткі на 200.000 руб. і на 105.000 руб. гарнітураў для трактарных і рамонтных рабочых.

Нязначны зрух

Тэмпы кантрактацыі і адкорму жывёлы яшчэ невыстарчальныя

Яшчэ нядаўна калегія саюзнага Наркамзему з абурэньнем адзначыла, што ў Беларусі кантрактацыя жывёлы ганебна правалілася. Ударыў гром — і людзі заварушыліся, паехалі з цэнтру ў акругі, акруговыя работнікі спусьціліся ў нізоўку і пачалі сёе-тое рабіць. Работа па кантрактацыі жывёлы зрушылася з мёртвага пункту, але тэмпы работы ўсё-ж такі яшчэ вельмі марудныя. Вось лічбы аб ходзе кантрактацыі жывёлы на 1 сакавіка.

З гадавога заданьня ў 49.000 галоў рагатай мясной жывёлы на 1-га сакавіка закантрактавана 10.790 галоў, або 22 проц. пляну. Зусім дрэнна ідзе кантрактацыя ў акругах Аршанскай, Бабруйскай і Менскай (17-20 проц.).

Па кантрактацыі племянной жывёлы гадавое заданьне выканана ў сярэднім на 32 проц. Пры гэтым добра ідзе работа ў акругах Мазырскай (103 проц.) і Магілеўскай (75 проц.). Дрэнна кантрактуецца племянная жывёла ў акругах Гомельскай, Менскай і Бабруйскай (ніжэй сярэдняга ўзроўню).

Кантрактацыя сьвіней на 1-га сакавіка выканана ў разьмеры 24 проц. (замест 36.000 закантрактавана 8.830 сьвіней). Больш-менш здавальняюча ідзе работа толькі ў Магілеўскай акрузе (50 проц.) і вельмі кепска ў акругах Гомельскай, Менскай і Віцебскай (16-18 проц.).

Значна лепш праходзіць кантрактацыя бэконных сьвіней — на 1 сакавіка заданьне ў сярэднім выканана на 57 проц., прычым некаторыя акругі перавыканалі заданьне — Гомельская (213 проц.), Мазырская (240 проц.), Магілеўская (120 проц.). Затое моцна адстаюць Полаччына (15 проц.) і Меншчына (30 проц.)

З гэтых лічбаў відаць, што кантрактацыя жывёлы — рагатай мясной і сьвіней — праходзіць зусім дрэнна. Пры такіх тэмпах кантрактацыі мы не забясьпечым нашых гарадоў мясам. Работу трэба разварушыць з ускладаньнем пэрсанальнай адказнасьці на работнікаў акруговых малочна - жывёлагадоўчых саюзаў. Трэба памятаць, **што ўсю работу па кантрактацыі жывёлы нам трэба скончыць да 1 мая, а па бэконных сьвіньнях — да 1 красавіка.**

Для забесьпячэньня нашых гарадоў мяснымі прадуктамі вялікае значэньне мае таксама выкананьне заданьня па адкорме жывёлы.

Заданьне на адкорме буйной рагатай жывёлы мы на 1 сакавіка ўжо выканалі нават з некаторым перавышэньнем — пастаўлена на адкорм 11.915 галоў, замест заданьня ў 11.045 галоў (107 процантаў).

Затое заданьне па адкорме сьвіней яшчэ ня выканана — на 1-га сакавіка пастаўлена на адкорм 27.000 сьвіней, замест заданьня ў 43.000 сьвіней (62 процанты выкананьня пляну).

Калі па адкорме сьвіней малочна-жывёлагадоўчыя саюзы значна перавыканалі план, а Белсельтрэст выканаў план на 53 проц., дык па лініі калгасаў справа гэта зусім правальваецца. Замест 20.000 галоў сьвіней пастаўлена ў калгасах на адкорм толькі 3.500 (17 проц.) — тут ніякай работы не вядзецца, ніхто гэтаю справаю ня цікавіцца.

Н.

Кантрактацыю адсоўваюць на задні плян

Збожжавых культур закантрактавана толькі 38 проц.

Ганебны правал на Поллаччыне

У рабоце па кантрактацыі пасеваў па БССР за апошнюю дэкаду наступіў некаторы зрух, але зрух гэты нязначны і не гарантуе нам выкананьня дырэктывы аб сканчэньні ўсёй работы па кантрактацыі да 15 сакавіка.

Прыгледзімся да лічбаў. Збожжавых культур на 1 сакавіка закантрактавана ўсяго толькі 38 проц. Калі прыняць пад увагу, што збожжавых культур мы, паводле пляну, павінны закантрактаваць усе 100 проц., дык гэты процант выкананьня пляну прыходзіцца прызнаць вельмі нязначным. Прасунуліся ўперад акругі Віцебская (63 проц.) і Аршанская (62 проц.), у хвасьце плятуцца Менская акруга (29 проц.) і асабліва Полацкая (16 проц.).

Некалькі вышэй, але таксама далёка яшчэ невыстарчальны разьмер кантрактацыі ільну - валакна (58 проц.) і ільну-семя (49 проц.). На першым месцы тут ідзе Віцебская акруга, якая выканала плян па ільну-валакне на 96 проц. і па ільну-семі на 78 проц. Таксама і тут па самым апошнім месцы плянецца Полаччына, якая выканала плян як па валакне, так і па ільну-семі толькі на 22,5 проц. **Для ільнаводнай Полацкай акругі такі разьмер кантрактацыі зьяўляецца ганебным.**

Лепш за ўсё ідзе кантрактацыя бульбы — 80,5 проц.

Пагражаючае становішча ў нас ствараецца з кантрактацыяй насеньня траў: канюшны закантрактавана 26,5 проц., вікі — 28,5 проц., лубіну — 17 проц., сэрадэлі — 13,4 проц. Нам трэба асабліва моцна націснуць на ўзмацненьне кантрактацыі траў, бо ад гэтага будуць залежаць пэрспэктывы забесьпячэньня кармамі нашай жывёлы.

Такім чынам, калі асобныя акругі (як Віцебская) па некаторых культурах набліжаюцца да выкананьня пляну, дык становішча з кантрактацыяй у рэшце округ застаецца вельмі сур'ёзным і патрабуе нашай пільнай увагі.

Адна з прычын такога маруднага ходу кантрактацыі заключаецца ў наступным. Многія работнікі на мясцох спрыяе калектывізацыі, шчыльна з ёю зьвязана і нельга аддзяляць адно ад другога.

Таксама і якасны бок работы па кантрактацыі ў нас не на вышыні. Скрозь і ўсюды дагаворы падпісваюцца без папярэдняга падрабязнага абмеркаваньня на агульных сходах калгаснікаў усіх умоў дагавароў і ўсіх пытаньняў, зьвязаных з кантрактацыяй, як выкананьне аграмінімуму, увязка кантрактацыі са сродкамі вытворчасьці, вытворчымі крэдытамі і г. д. Гэтыя прарывы, якія могуць у моцнай ступені зьнізіць вытворчы эфэкт кантрактацыі, трэба неадкладна ліквідаваць.

У некаторых калгасах выяўляецца зусім няправільная тэндэнцыя да замены тых культур, якія паказаны ў дагаворы, іншымі культурамі, напрыклад, больш працаёмкую культуру ільну — менш працаёмкай культурай бульбы. Такія шкодныя тэндэнцыі трэба пераламаць.

І, нарэшце, трэба сказаць, што наша грамадзкасьць (вясковы актыў, камсамол) хаця і займаецца пытаньнямі падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, але ня выдзяляе кантрактацыі, як аднэй з асноўных і важных частак пасеўнай кампаніі, і фактычна не дапамагае гэтай рабоце.

Мы настойліва будзем патрабаваць сканчэньня ўсёй работы па кантрактацыі да ўстаноўленага тэрміну — 15 сакавіка — і пры гэтым не дапусьцім ні ў якім выпадку зьмен плянаў па кантрактацыі ў бок іх зьмяншэньня.

Л. Н—даў.

АЦЭНКА ЖЫВЁЛЫ ПРЫ ЎСТУПЛЕНЬНІ Ў КАЛГАС

Толькі адны разважаньні

Да пабудовы агра-індустрыяльных камбінатаў ня прыступлена

Усімі інстанцыямі, у тым ліку і саюзнымі, у плян будаўніцтва бягучага году ўключана пабудова ў БССР 2-х агра-індустрыяльных камбінатаў Жлобіна - Рагачэўскага, Бабруйскай акругі, і Ляднянска - Дубровенскага, Аршанскай акругі. У кожным з гэтых раёнаў калектывізацыя праведзена аж на 90 проц.

Але, ня гледзячы на ўсе спрыяючыя ўмовы для будаўніцтва гэтых камбінатаў, да апошняга часу **няма ні толькі зацьверджанай праграмы будаўніцтва, а нават не распрацаваны арганізацыйныя пляны.**

Толькі нядаўна НКЗ БССР прыняў пастанову аб гаспадарчай накіраванасьці гэтых камбінатаў.

Невядомы яшчэ гэаграфічныя пункты разьмяшчэньня асноўных прадпрыемстваў камбінатаў, гэта не дае магчымасьці распачаць загатоўку матар'ялаў, падрыхтоўку пляцовак, нельга весьці і земляных работ.

Будаўнічыя арганізацыі ня выкарысталі саннае дарогі для вывазкі лесаматар'ялаў; праўленьні камбінатаў, чакаючы прысылкі з Менску падрабязна распрацаванага каляндарнага пляну работ, ніяк ня могуць прыступіць да канкрэтнае работы.

Вельмі востра стаіць пытаньне аб **забесьпячэньні вадою прадпрыемстваў гэтых агра-камбінатаў.** Перасякаючая Жлобінска - Рагачэўскі раён рэчка ня можа даць і сотай часткі вады, патрэбнай для ўсіх індустрыяльных прадпрыемстваў і цёплаэлектрацэнтраляй камбінатаў.

Мясцовыя арганізацыі па водазабесьпячэньні (Водбюро, Белкалгасбуду, а таксама Менскае аддзяленьне Валакналу) не прыступаюць да канкрэтнага вырашэньня пытаньня аб забесьпячэньні вадою камбінатаў, спасылаючыся на адсутнасьць у іх належных спэцыялістых.

Таксама адсутнічаюць тэхніка-эканамічныя разьлікі будаўніцтва. Гэта не дае магчымасьці прыступіць да папярэдніх перагавораў з замежнымі фірмамі і нашымі імпартнымі арганізацыямі каконт дастаўкі абсталяваньня як для ільнаапрацоўчага і крухмальнага заводаў, а таксама і для цёплаэлектрацэнтралі.

Усе гэтыя прычыны затрымліваюць будаўніцтва гэтых вялізарных агракамбінатаў.

Дзеля таго, каб зрушыць з мёртвага пункту пабудову камбінатаў, трэба як мага хутчэй перайсьці ад абстрактных разважаньняў да практычнае работы.

Саюзны Наркамзем павінен усе аб'екты будаўніцтва камбінатаў узяць пад свой непасрэдны кантроль. Трэба вызначыць дакладныя тэрміны выкананьня канкрэтных работ будаўніцтва. Мы павінны строга разьмежаваць функцыі паміж асобнымі арганізацыямі, якія прымаюць удзел у будаўніцтве гэтых агра-камбінатаў і ўстанавіць паасобку адказнасьць кожнае з гэтых арганізацый за пэўную частку праведзенай ёю работы.

І—н.

Забясьпечым гарады рыбай

РЫБАЦКІЯ АРЦЕЛІ У СТАНЕ БЯСПРЫТУЛЬНЫХ

Паводле пастановы Эканомнарады БССР, Белсампрамсаюз павінен быў у двухтыднёвы тэрмін прыняць ад сельска - гаспадарчай і паляўнічай кааперацыі ўсе рыбалоўныя і рыбаводныя арцелі. Адначасова на сыстэму саматужна - прамысловай кааперацыі была ўскладзена задача — арганізаваць новыя арцелі. Белсампрамсаюзу было прапанавана вылучыць спэцыяльны інструктарскі апарат і ва ўдарным парадку заняцца рыбацкай справай.

Ня гледзячы на тое, што пасьля пастановы Эканомнарады ўжо прайшло амаль два месяцы, нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку ня зроблена. На мясцох да практычнае работы па прыёме рыбацкіх арцеляй яшчэ ня прыступлена. Характэрна, што ў гэтай важнай справе не праяўляюць сваёй ініцыятывы і некаторыя акрвыканкомы. Так, напрыклад, Полацкі АВК пастанавіў устрымацца ад практычнага вырашэньня гэтага пытаньня, пакуль ня будзе атрымана падрабязная інструкцыя.

Белсампрамсаюз таксама чакае нейкіх інструкцый і нічога канкрэтнага ня робіць. Белкалгасцэнтр лічыць, што гэтае пытаньне будзе вырашана толькі тады, калі нарэшце будзе вырашана пытаньне аб узаемаадносінах з сампрамкаапэрацыяй.

Такія нядбайныя адносіны да рыбаводзтва пагражаюць выкананьню пляну забесьпячэньня рыбай, паводле якога прадугледжваецца павялічэньне ўлову рыбы на 200 проц. супроць мінулага году.

Трэба, каб адпаведныя арганізацыі вызвалі вінаватых у гэтай цяганіне і за невыкананьне дырэктыў ураду прыцягнулі іх да судовае адказнасьці.

Л—н.

Дырэктывы аб забесьпячэньні рабочых прадуктамі харчаваньня ня выконваюцца

Эканамічная нарада БССР заслухала даклад Наркамгандлю аб забесьпячэньні рабочага насельніцтва прадуктамі харчаваньня. Эканомнарада адзначыла **недапушчальна слабы ход загатовак масла і запрапанавала Белсельтрэсту і Белмалочсаюзу прыняць самыя рашучыя меры да поўнага выкананьня плянаў загатовак і забараніць выдачу кармоў тым гаспадаркам і калгасам, якія ня выконваюць абавязкаў па здачы масла.**

Эканомнарада таксама адзначыла, што **няма перапому ў галіне грамадзкага харчаваньня, што харчаваньне ня толькі не палепшылася, але нават пагоршылася.** Белкаапсаюзу і Белрабсэкцыі даручана ў бліжэйшы час палепшыць якасьць абедаў і абслугоўваньне спажыўца.

Эканомнарадай адзначана **невыкананьне загатоўчымі арганізацыямі плянаў мясазагатовак.** Наркамгандлю і Акрвыканкомы павінны прыняць самыя рашучыя меры да забесьпячэньня гарадоў мясам.

ПЕРАВЕСЬЦІ НА ТРЫ ЗЬМЕНЫ

Збожжаачышчальныя машыны яшчэ не нагружаны

Ажыцьцяўленьне катэгарычных дырэктыў партыйных органаў і ўраду БССР аб агранамічных мерапрыемствах да веснавой сяўбы праходзіць зусім нездавальняюча.

На 1-га сакавіка адпушчана 125.632 тоны збожжа, або 65 проц. заданьня. Па асобных акругах становішча яшчэ горшае. Так, Полацкая акруга выканала заданьне на 52,6 проц., Гомельская — 57 проц., Відебская — 56,7 процантаў, Бабруйская — 57 проц. Між тым, па БССР ёсьць належныя колькасьць збожжаачышчальных машын. Пры энэргічнай рабоце можна было-б ачысьціць збожжа поўнасьцю. Але ва многіх акругах яшчэ дагэтуль машыны не загружаны. Ня выконваецца дырэктыва аб пераводзе збожжаачышчальных машын на 2-3 зьменную работу. Ёсьць нават факты бязьдзейнасьці абозаў.

Месцы не інфармуюць Белпаляводсаюз і НКЗ аб становішчы з ачысткай збожжа на мясцох. Ня гледзячы на частыя запытаньні, Белпаляводсаюз дагэтуль ня можа атрымаць вестак аб колькасьці працуючых машын і існуючым парадку аплаты за ачыстку збожжа.

ХТО-Ж БУДЗЕ ПРАТРУЧВАЦЬ НАСЕНЬНЕ

Торг паміж паляводсаюзам і Асоавіяхімам

Раней меркавалася, што становішча з пратручваньнем насеньня здавальняючае. Акругі паведамілі, што яны забясьпечаны хэмікаліямі поўнасьцю. Каб праверыць гэта, Белпаляводсаюз тэлеграфна яшчэ запытаў месцы, але адказу няма.

Аднак, зараз паўстала другая пагроза — невядома, хто-ж будзе арганізоўваць і праводзіць пратручваньне, як у калгасах, так і ў індывідуальным сэктары. Як відаць, зямельныя органы не прадугледзелі ў сваіх плянах падрыхтоўкі кадраў для гэтай справы. Курсы на 300 калгаснікаў, якія зараз праводзяцца, не могуць задаволіць патрэб, калі прыняць пад увагу, што трэба пратручваць усе 100 проц. насеньня ў сацыялістычным сэктары і 25 проц. у індывідуальным сэктары.

Ганебны ў гэтай справе паводзіны такой масавай грамадзкай арганізацыі, як Асоавіяхім. Белпаляводсаюз на працягу двух тыдняў вядзе перагаворы з Асоавіяхімам БССР, каб ён узяў на сябе праведзеньне масавай кампаніі па пратручваньні насеньня. Аднак, Асоавіяхім не згаджаецца выконваць гэта ў грамадзкім парадку і за ўсё просіць грошы. Так, на арганізацыю адных толькі курсаў Асоавіяхім просіць 12.000 руб.

Брыгады беспрацоўных па рамонце с.-г. інвэнтару ў калгасах

Наркампрацы БССР запрапанаваў усім інспэктарам працы ў акругах неадкладна прыступіць да арганізацыі брыгад з беспрацоўных па рамонце с.-г. машын у калгасах.

Запрапанавана скарыстаць рабочую сілу, якая ёсьць на біржах працы, для арганізацыі брыгад з токараў, сьлесараў, кавалёў і цесьляроў, у мэтах пасылкі іх на вёску для рамонту с.-г. інвэнтару ў калгасах.

Арганізацыя брыгад павінна быць праведзена ва ўдарным парадку.

Па БССР

Пад суд—за зрыў месячніка ашчаднасьці

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). За нядбайныя адносіны да месячніка ашчаднасьці прыцягнуты да судовай адказнасьці старшыня Гомельскай раённай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту, а таксама зьняты з работы кантралёр касы ашчаднасьці пры Дзяржбанку **Айбіндэр.** Абвешчаны вымовы старшыням Камарынскай і Цэрахаўскай камісій садзейнасьці дзяржкрэдыту і бухгальтару Дзяржбанку Ільгуту.

Дапаможам суцэльнай калектывізацыі Горацкага раёну

ГОРКІ. (Наш. кар.). Агульны сход студэнтаў і навуковых працаўнікоў с.-г. акадэміі, заслухаўшы даклад старшыні СНК т. Гападзеда аб палітыцы партыі і Савецкае ўлады ў зьвязку з індустрыялізацыяй і калектывізацыяй краю, цалкам і поўнасьцю ўхваліў усе мерапрыемствы партыі і Савецкае ўлады. Студэнцтва і навуковыя працаўнікі абяцаюць аддаць усе свае сілы і веды для правядзеньня ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў ураду па далейшым разгортваньні калектывізацыі і ў прыватнасьці па правядзеньні суцэльнае калектывізацыі Горацкага раёну, дзе знаходзіцца с.-г. акадэмія.

Няшчасны выпадак на заводзе па віне тэхнічнага нагляду

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Гэтымі днямі ў часе работы трапіла ў трансьмісію карэнярдрабілкі работніца **заводу Імя Лекерта т. Кір'якава.** Інспэкцыяй працы ўстаноўлена, што гэты няшчасны выпадак здарыўся па віне заводскага тэхнічнага пэрсаналу, які не агародзіў карэнярдрабілку. Вінаватыя ў нядбайных адносінах да аховы працы на заводзе адлюцца пад суд. Пацярпеўшая работніца Кір'якава адаслана ў больніцу. Заўком пастанавіў зрабіць матар'яльную дапамогу сям'і т. Кір'якавай на час яе хваробы.

Фізкультурнікі дапамагаюць чысьціць насеньне

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). Брыгады фізкультурнікаў заданьне па ачыстцы насеньня для калгасаў выканалі з перавышэньнем. Усяго фізкультурнікі ачысьцілі 1.400 пудоў насеньня. Наперадзе ідуць фізкультурнікі саюзу харчанікоў, якія замест вызначаных 150 пудоў, ачысьцілі 750 пудоў насеньня для калгасаў.

Месячнік ашчаднасьці на Мазыршчыне і Клімаўшчыне вельмі слаба разгортваецца

Сакратарыят ЦВК БССР адзначыў нездавальняючы ход месячніка ашчаднасьці па Мазырскай акрузе і зусім слабое разгортваньне месячніка на Клімаўшчыне. Сакратарыят прапанаваў Мазырскаму АВК прыняць усе меры, каб узмацніць работу па месячніку.

ПАУТАРАЮЦЦА ЛЕТАШНІЯ ПАМЫЛКІ

Будаўнічыя арганізацыі—без праектаў без рабочай сілы

ОРГАНЫ РСІ ПАВІННЫ ЎЗЯЦЬ ПАД КАНТРОЛЬ БУДАЎНІЧЫЯ РАБОТЫ

Памылкі мінулых будаўнічых сэзонаў мала чаму навучылі нашы будаўнічыя арганізацыі. З розных акруг БССР паступаюць весткі аб **дрэнным падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону, аб адсутнасьці плянаў і праектаў, аб недахваце рабочай сілы і будаўнічых матар'ялаў.** Будаўнічыя арганізацыі не паклапаціліся загадая падрыхтаваць матар'ялы і рабочую сілу, і зараз, калі будаўнічы сэзон набліжаецца сімімільнымі крокамі, б'юць трывогу і патрабуюць тэрміновых мер.

У **Воршы,** напрыклад, прадугледжваецца выдаць каля 20 мільёнаў руб. на будаўніцтва; на будаўнічых работах будзе занята каля 17.000 розных кваліфікацый. Між тым, вельмі нязначная колькасьць будаўнічых аб'ектаў забясьпечана рабочай сілай; прыдзецца шмат рабочых завезьці з іншых округ і раёнаў. Будаўнічыя арганізацыі забясьпечваюць матар'ялямі толькі на 20 проц. Многія з іх ня маюць праектаў, плянаў і рабочых чарцяжоў. Аршанскія будаўнічыя арганізацыі дагэтуль яшчэ не паклапаціліся, каб падрыхтавацца да сэзону. З 14-га лютага Аршанская РСІ ніяк ня можа склікаць нараду будаўнічых арганізацый.

Такі-ж прыблізна малюнак і ў **Мазырскай акрузе.** Намечана пабудаваць 85 аб'ектаў на суму 2 млн. руб. Між тым, у будаўнічай канторы дагэтуль няма прамфінплану, няма дакладных лічбаў аб колькасьці патрэбных матар'ялаў, рабсілы і тэхпэрсаналу.

Рабочая брыгада, якая абсьледавала **Гандальбуд** у Менску, канстатуе, што трэст вельмі дрэнна падрыхтаваны да будаўнічага сэзону. Прамфінплян 1929-1930 году ня мае канкрэтных аб'ектаў новага будаўніцтва. На агульных сходах рабочых, за выключэньнем кафэльнага заводу, прамфінплян не абгаворваўся. З Лесбелам яшчэ ў кастрычніку і сьнежні мінулага году былі заключаны дагаворы на дастаўку лесаматар'ялаў на суму каля 600 тыс. руб. Але дагэтуль **нічога не атрымана.** Каменьняў загатоўлена толькі 16,6 проц. патрэбнай колькасьці. Не хапае 60 проц. патрэбнай для выкананьня пляну колькасьці цэмэнту. У даны момант на пабудовах ёсьць звыш 40 вагонаў цэмэнту, прычым гэты цэмэнт так добра «захоўваецца», што частка яго пакрыта сьнегам і можа зусім папсавацца.

Брыгада абсьледавала асобныя пабудовы Гандальбуду і знайшла, што якасьць работы пакідае жадаць шмат лепшага. Сьцены і падлогі далі шчыліны, многае прышлося перарабляць.

Саюспаборніцтва на пабудовах праводзілася дрэнна, вытворчая камісія не кіравала ім. З-за недахвату матар'ялаў на пабудове дзяржбібліятэкі, рабочыя прасталялі без работы каля 34,5 дзён. **Насьценгазэты вельмі мала зварачалі ўвагі на пытаньні вытворчасьці і саюспаборніцтва.**

Бюро парткалектыву **Гандальбуду** не завастрыла ўвагі на пытаньні падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону і выкананьня прамфінпляну. Вельмі мала зроблена для разгортваньня саюспаборніцтва паміж камуністамі і камсамольцамі.

Брыгадай выяўлен рад агідных фактаў злачынна-нядбайнага хаваньня будаўнічых матар'ялаў, 700 скрынь бэмскага шкла на працягу некалькіх месяцаў ляжала пад плотам нянрыкрытым і занесеным сьнегам. Валяўся пад сьнегам і дрот. Якраз пад вадасточнай трубой ляжаць стосы з некалькіх сот дубовых дошак для паркету. Цэгла, якая дастаўляецца на будаўніцтва дзяржбібліятэкі, так «добра» укладваецца ў клеткі, што вясной значная частка будзе папсавана.

Амаль што нічога ня зроблена для выкананьня дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту будаўнічых работ.

Эканомнарада БССР нядаўна абгаварыла пытаньне аб **падрыхтоўцы да капітальнага будаўніцтва ў 1929-30 годзе** і ў спэцыяльнай пастанове адзначыла, што будаўнічыя арганізацыі ня выканалі пастановы Эканомнарады ад 29-га жніўня, не падрыхтавалі праектаў і кашторысаў будаўніцтва. Па радзе аб'ектаў дагэтуль няма праектаў; **большасьць дагавароў на выкананьне будаўнічых работ да гэтага часу не заключана;** ня вызначаны месцы пад пабудовы, што перашкаджае будаўнічым арганізацыям правільна падвозіць будаўнічыя матар'ялы. Не распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы для зьніжэньня сабекошту будаўніцтва па кожным праекце асобна.

Эканомнарадай вызначан рад мерапрыемстваў для паскарэньня тэмпу будаўнічых работ. Гаспадарчыя і будаўнічыя арганізацыям прапанавана не пазьней 15-га сакавіка заключыць дагаворы на выкананьне работ. Будаўнічаму камітэту і Наркамгандлю даручана неадкладна разьмеркаваць будаўнічыя матар'ялы.

Органы РСІ павінны зацікавіцца падрыхтоўкаю да будаўнічых работ, дабіцца, каб сэзон мог пачацца своячасова, каб не паўтарыліся прыкрыя памылкі мінулых гадоў.

Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту павінна быць выканана як-бы там ні было.

Б—ў.

ПАДВОЗКА ЦЭГЛЫ НА ПАБУДОВЕ ДОМУ ЎРАДУ Ў МЕНСКУ

Месячнік лесазагатовак

Наступіў пералом

ЗА АПОШНЮЮ ДЭКАДУ ВЫВЕЗЕНА 18 ПРОЦ. ГАДАВОГА ЗАДАНЬНЯ

Апошняя дэкада лютага характарызуецца некаторым пераломам у разьвіцьці загатовак і вывазкі лесу. За апошнюю дэкаду вывезена звыш 680.000 куба-мэтраў лесаматар'ялаў, або **18 проц. гадавога заданьня.** У параўнаньні з мінулай дэкадай, **вывазка павялічылася больш, чым на 30 проц.**

Усяго на 1-ае сакавіка Лесбел загатовіў 86,1 проц. і вывез 61 проц. гадавога пляну.

Асаблівы пералом адзначаецца па **Віцебскім, Полацкім, Бабруйскім, Чэрвеньскім і Вузьдзенскім лесараёнах,** якія выканалі за 8 апошніх дзён лютага ад 22 да 27 проц. сваіх плянаў.

Адстаюць **Барысаў, Гомель, Магілеў і Мазыр.**

Вялікі ўплыў па ўзмацненьне вывазкі лесу зрабілі рашучыя меры, прынятыя акруговымі і раённымі выканаўчымі камітэтамі, а таксама пракуратурай.

Аднак, і дагэтуль у асобных мясцох наглядаюцца **зусім нядбайныя адносіны да гэтай кампаніі.**

З **Мазырскай акругі** паведамляюць, што **калгасы дагэтуль ня прымаюць ніякага ўдзелу у месячніку лесазагатовак.** Сельсаветы Любанскага раёну, Бабруйскае акругі, ня прыцягваюць да гужавое павіннасьці кулацкіх гаспадарак, заяўляючы, што «кулакоў хутка раскулачаць».

Злачынная нядбайнасьць і шкодная канкурэнцыя наглядаецца на **Хойніцкім вучастку** Гомельскага лесараёну. Да 1-га сакавіка вывезена толькі 26 проц. заданьня па лесаматар'ялах і 35 проц. па дрывах. Для таго, каб загатоўкі былі выкананы ў вызначаныя тэрміны, трэба, каб кожны дзень працавала звыш 2.000 лесарубаў, у апошняй дэкадзе ўтая працавала толькі 770. Аднак, і гэта колькасьць лесарубаў дрэнна забясьпечана кватэрамі, прыходзіцца спаць на падлозе.

Каб выканаць плян вывазкі, на вучастку павінна было езьдзіць у лес кожны дзень каля 8.000 фурманак, працавала-ж іх толькі 2.873. Трэба было прыцягнуць да гужавое павіннасьці 500 кулацкіх фурманак, фактычна-ж прыцягнута ня больш 100. Гэта здарылася таму, што як РВК, так і сельсаветы абмежаваліся толькі перадачай абвестак кулацкім гаспадаркам. РВК толькі нядаўна вынес пэрсанальную вымову 5-ці сельсаветам, якія зрывалі загатоўкі, ня лічачы патрэбным прыцягнуць іх да больш суровай адказнасьці. Арганізацыі —Лесбел, «Железком» і «Дорстрой» займаюцца шкодная канкурэнцыяй, адбіваючы адна ад другое фурманкі і лесарубаў.

Па **Магілеўскай акрузе** з 2.830 кулацкіх коняй на вывазцы занята каля 100. У Крычаўскім раёне павінна было быць занята 360 коняй, займаюцца вывазкай толькі 6.

З **Чэрнеўскага ўдарнага лесазагатоўчага вучастку** паведамляюць, што 100-процантнае выкананьне заданьня, якое прадугледжана сацдагаворам прапаўнікоў вучастку, знаходзіцца пад пагрозай зрыву, бо мясцовыя арганізацыі ня прымаюць мер, каб разгарнуць шырокую кампанію.

Да вясны, да бездарожжа, да пачатку сплаву засталося вельмі мала часу. Калі бліжэйшыя тыдні ня будуць скарыстаны для поўнага выкананьня заданьня па вывазцы лесу, пляны забясьпячэньня прамысловасьці і экспартныя пляны будуць сарваны.

Трэба неадкладна прыняць самыя рэпрэсыўныя меры ў адносінах да ўсіх тых арганізацый, якія зрываюць лесазагатоўкі, якія шукаюць розных «аб'ектыўных прычын», каб імі не займацца.

С.

Яскравыя прыклады права-апартуністычнае практыкі

У Лёзьнянскім раёне (Віцебшчына) распускаюць групы беднаты

Забылі пра беднату

Лёзьнянскі раён, Віцебскай акругі, на 1-га сакавіка ўжо калектывізаваны на 70,5 проц. У гэтым раёне была даволі моцная група кулацкіх гаспадарак. Таму зараз, пры масавай калектывізацыі раёну, работа сярод беднаты і батрацтва набывае асаблівае значэньне. Але дырэктывы партыі аб рабоце сярод беднаты не знайшлі належнага праламленьня ў Лёзьнянскім. Практыка калектывізацыі ў гэтым раёне паказвае, што **мясцовыя работнікі недаацэньваюць значэньня беднаты і батрацтва.** Ня гледзячы на тое, што ў раёне знаходзіцца 13 калгасаў, якія арганізаваны ў папярэднія гады, і 10 калгасаў летась, у іх дагэтуль **яшчэ не арганізаваны групы беднаты.** У каапэрацыі, сельсаветах і інш. арганізацыях па вёсцы таксама няма груп. Наадварот, некаторыя парт'ячэйкі замест пашырэньня работы сярод беднаты **імкнуліся яе згортваць. У РАДЗЕ СЕЛЬСАВЕТАЎ ГРУПЫ БЕДНАТЫ БЫЛІ РАСПУШЧАНЫ І ЛІКВІДАВАНЫ.**

Некаторыя ячэйкі пры правядзеньні калектывізацыі не апіраліся на беднату. У вёсках Нова - Сямёнава і Савеліна, Беляшкоўскага сельсавету, толькі адзін раз быў праведзены сход беднаты, прысьвечаны калектывізацыі. У выніку адсутнасьці ўсякае работы сярод беднаты гэтыя вёскі зьяўляюцца найбольш адсталымі па калектывізацыі.

У Субоцкім сельсавеце пытаньне аб кантрактацыі малака на сходзе беднаты папярэдне не абмяркоўвалася, а было адразу пастаўлена па агульнасялянскім сходзе. З прычыны таго, што бедняком гэта пытаньне ня было растлумачана, на сходзе некаторыя беднякі выступалі супроць кантрактацыі.

Яшчэ 13-га сьнежня на бюро РК КП(б)Б стаяла пытаньне аб працы сярод беднаты. Была вылучана камісія для вывучэньня гэтага пытаньня і складаньня рэзалюцыі. **Камісія дагэтуль яшчэ рэзалюцыі не напісала.**

Адсутнасьць работы сярод беднаты прывяла да таго, што кулакі зараз зноў падняли галаву. На прыкладзе Лёзьнянскага раёну можна пераканацца да чаго прыводзіць недаацэнка работы сярод беднаты і батрацтва.

Брыгадзір «Зьвязды» ТАМІЛІН.

ЗБОР УТЫЛЬСЫРЦУ ВА УВАРАВІЦКІМ РАЁНЕ

Перагібы пры абагуленьні

У Пятрыкоўскім раёне, Мазырскае акругі, пры правядзеньні суцэльнае калектывізацыі і раскулачваньні наглядаўся вялікі творчы ўздым сярод шырокіх бядняцка-сераднянцкіх мас сялянства. Аднак, мясцовыя працаўнікі суп

МЕНСК

Закладка фабрыкі-кухні

Пазаўчора адбылася ўрачыстая закладка фабрыкі-кухні ў Менску. На ўрачыстасьці прысутнічала капя 400 рабочых і работніц. Фабрыка-кухня будзе будавацца ў былым садзе спраўдому, па Сьвярдлоўскай вуліцы.

Адкрыўшы ўрачысты сход, прысьвечаны закладцы фабрыкі-кухні, старшыня МЦРК т. Кац спыніўся ў сваёй прамове на значэньні грамадзкага харчаваньня ў нашым будаўніцтве і ў вызваленьні жанчыны ад работы на кухні.

Фабрыка-кухня будзе адпускаць у дзень 24 тыс. абедаў.

З прывітаньнямі выступалі: сакратар Менскага АК КП(б)Б т. СЛАВІНСКІ, старшыня ЦСПСБ т. РЫЖОЎ і намесьнік старшыні гарсавету т. КРУЗМАТ.

Фабрыка-кухня названа імем 8-га сакавіка.

ЗАКЛАДКА ФАБРЫКІ-КУХНІ Ў МЕНСКУ

ТАВ. СЛАВІНСКІ КЛАДЗЕ ПЕРШЫ КАМЕНЬ

Белжылсаюз зрывае пабудову дамоў-камун

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у сваёй рэзалюцыі аб матар'яльным становішчы і культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых прапанаваў Дзяржпляну, а ўдзелам адпаведных установаў і арганізацый, распрацаваць праект рабочага пасёлку, які зьяўляўся-б узорным і цалкам адпавядаў-бы задачам камуністычнага быту, з такім разьлікам, каб ужо ў 1929-30 гаспадарчым годзе можна было практычна прыступіць да яго пабудовы.

Як-жа выконваецца гэта пастанова? **Зусім дрэнна.**

Гэтымі днямі прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў даклад Белжылсаюзу аб тым, што ім зроблена ў сэнсе ажыцьцяўленьня пастановы ЦК. Можна сьмела сказаць, што вельмі мала. Белжылсаюз складае праекты пабудоў памяшканьняў камун габінэтным парадкам, бяз удзелу рабочай масы. Праекты, якія былі паданы прэзыдыуму ЦСПСБ, далёка не адпавядаюць свайму прызначэньню. Адзін варыянт праекту дому камуны, распрацаваны Белжылсаюзам, прадугледжвае, што бацькі павінны жыць асобна ад дзяцей, а другі праект лічыць, што дзеці павінны жыць разам з бацькамі. Дамы-камуны на 500-600 чал. Белжылсаюз мяркуе пабудаваць у Гомелі, Менску, Віцебску, Бабруйску, Магілеве. Але... гэтыя праекты не абгаворваны на рабочых сходах, абодва яны маюць значныя дэфэкты.

Прэзыдыум ЦСПСБ адзначыў недапушчальныя адносіны з боку Белжылсаюзу да гэтага важнага пытаньня.

Трэба зараз-жа абгаварыць на рабочых сходах пытаньне аб пабудове дамоў-камун. Трэба пабудаваць адзін дом для рабочай моладзі, улічваючы тое, што моладзь больш падрыхтавана для камуністычнага жыцьця.

Вечар вылучэнцаў-друкароў

Нядаўна ў клюбе друкароў адбыўся другі вечар сустрэчы вылучэнцаў з рабочымі.

Вылучэнцы расказалі рабочым аб сваёй працы на новых пасадах. Удзельнікі вечару знаёміліся як з адмоўнымі, так і са станоўчымі бакамі работы вылучэнцаў на новых мясцох.

Былі выпадкі, калі спэцы па некаторых установах, асабліва ў аддзеле грамадзкага харчаваньня МЦРК, глядзелі на вылучэнцаў, як на нейкіх непрацаздольных людзей, з якіх нічога ня выйдзе.

Выступаўшыя вылучэнцы адзначалі, што апарат МЦРК засьмечаны былымі ганділярамі. Умовы працы для вылучэнцаў там цяжкія, і рабочыя-вылучэнцы зусім хацелі адмовіцца ад работы.

Характэрны выпадак здарыўся ў 4-й сталоўцы МЦРК, загадчыкам якое аьяўляецца вылучэнка **Дарафеева.** У гэту сталоўку было прыслана мяса дрэннай якасьці, ад яго несла карболаўкай. Дарафеева аб гэтым факце заявіла ў МЦРК. Санкамісія праверыла гэты факт і таксама прызнала, што якасьць мяса дрэнная. Але ў выніку, Дарафеева атрымала суровую вымову за... безгаспадарчасьць.

Вялікае ажыўленьне выклікала выступленьне нам. загадчыка Камгасу тав. **Нячаева.** Яму было задана шмат пытаньняў, напрыклад: як праводзіцца клясавая лінія пры муніцыпалізацыі, чаму яшчэ не муніцыпалізаваны ўсе дамы ліпэнцаў і інш.

Прадстаўнік ЦК саюзу друкароў тав. **Філіпаў,** які таксама быў на вечары, у сваім выступленьні завастрыў увагу рабочых на ролі і значэньні вылучэнства.

Вечар прайшоў вельмі жвава. Прынята пастанова часьцей наладжваць такія вечары сустрэчы вылучэнцаў з рабочымі. Пастаноўлена таксама склікаць спэцыяльную нараду вылучэнцаў саюзу друкароў, якія працуюць у МЦРК.

ПНОЎ.

Падрыхтоўка кадраў кваліфікаваных рабочых

Сёлета будзе адкрыты рад навучальных устаноў і курсаў па прафэсыянальна-тэхнічнай асьвеце. У 16 школ фабзавучу ў Гомелі, Віцебску, Менску, Магілеве і інш. гарадох будуць ПРЫНЯТЫ 1.300 ВУЧНЯЎ. Адкрываецца 60 ВЯЧЭРНІХ КУРСАЎ па прафтэхасьвеце на ўсіх буйных прадпрыемствах, на якія пераважна будзе прымацца рабочая моладзь.

Вызначана арганізацыя курсаў: па рацыяналізацыі — на 50 чалавек, курсаў для рабочых - ударнікаў — на 80 чалавек, па падрыхтоўцы дзесятнікаў-будаўнікоў — на 170 чалавек, электрамацёраў для вясковай электрыфікацыі —100 чал., рабочых для сплаву — на 125 чал., дзесятнікаў па лесазагатоўках —на 180 чалавек.

У Віцебску арганізуецца ШКОЛА-ФАБРЫКА на 1.400 чал. па падрыхтоўцы кваліфікаваных швэйнікаў для новай швэйнай фабрыкі. Такія-ж школы фабрыкі адкрываюцца ў Бабруйску—на 240 чал. і ў Гомелі — на 120.

Усяго па прамысловасьці БССР будзе адкрыта розных курсаў па пераквалі-фікацыі і падрыхтоўцы новых кадраў НА 4.500 ЧАЛ., на што асыгнавана 2.770.000 РУБ.

Прадукцыя хлебазаводу нездавальняючая

На заводзе выяўлены рад выпадкаў шкодніцтва

Гэтымі днямі ў памяшканьні клюбу хлебазаводу (былое сынагогі) адбыўся сход рабочых, на якім разглядалася заметка, зьмешчаная ў газэце «Зьвязда» ад 4 сакавіка. У заметцы паведамлялася аб тым, што ў булцы і бахацы хлеба былі знойдзены дрот і жалезны крук.

Рабочыя з абурэньнем выступалі супроць тых шкодніцкіх учынкаў, якія яшчэ і вараз здараюцца на хлебазаводзе. Многія в выступаўшых таварышоў зазначалі, што наогул шкодніцтва і нядбайнасьць зьвялі сабе гняздо на заводзе. Былі выпадкі, калі ў машыну в цестам трапляў кручок, палкі ад шчотак. Ніхто гэтых рэчаў не даставаў. І такім чынам, потым у 20-ці булках знаходзіліся вялікія трэскі з дрэва.

На заводзе было і хуліганства. Некаторыя несьвядомыя рабочыя па 2 гадзіны не працавалі, а на заўвазі майстра пагражалі яму расправаю.

Сход даручыў дырэкцыі заводу і заўкому ў тэрміновым парадку расьсьледаваць падрабязна гэтую справу. У адказ на шкодніцтва, рабочыя аднагалосна пастанавілі падпісацца на новую пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» на свой поўны месячны заработак.

ПРОДАЖ ПРАМТАВАРАЎ ЗВЫШ НОРМЫ

У бліжэйшыя дні зьніжаюцца цэны на тавары, якія да гэтага часу прадаваліся бяз кніжак па падвойных цэнах. Устанаўляецца накідка ў разьмеры 80 проц.

ЗА ДЗЕНЬ

Мастацкае афармленьне ўсебеларускай с. - г. выстаўкі. Пры дырэкцыі ўсебеларускай с.-г. выстаўкі створаны мастацка - палітычны савет для нагляду за мастацкім афармленьнем выстаўкі. На тэрыторыі выстаўкі будзе выстаўлены манумэнт-статуя Ільліча. Складаньне праекту манумэнту даручана архітэктру Грубэ.

Новы намесьнік старшыні Белрабсэкцыі. Былы старшыня ЦП саюзу швэйнікаў т. Сулькіна выбрана намесьнікам старшыні Белрабсэкцыі.

ЗЬВЯЗДА.

Правілы прыему на усебеларускія курсы камсамольскага актыву пры Камуністычным Унівэрсытэце Беларусі імя У І. Леніна

На 1930-31 нав. год

1. Курсы камсамольскага актыву знаходзяцца пры Камвузе Беларусі імя Леніна і маюць на мэце падрыхтаваць камсамольскага працаўніка раёну, калектыву і буйной камсамольскай ячэйкі шляхам вывучэньня тэорыі і практыкі марксызму-ленінізму, гісторыі і практыкі саюзнай работы.

2. Тэрмін навучаньня на курсах аднагадовы.

3. На курсах праходзяцца агульнаасьветныя і грамадзкія дысцыпліны. Агульна-асьветныя: беларусазнаўства, расійская мова, прыродазнаўства, фізыка, матэматыка, эканамічная і фізычная геаграфія. Грамадзкія: гісторыя клясавай барацьбы, палітэканомія, эканомпалітыка, гісторыя УсеКП(б) і КП(б)Б, ленінізм, гістарычны матэрыялізм, партбудаўніцтва, гісторыя юнацкага руху, арганізацыя мэтодыкі камсамольскай працы і работа юных піянэраў.

4. На курсы прымаюцца члены і кандыдаты КП(б)Б, камсамольцы з вытворчым стаам у вытворчасьці, або па найме ў сельскай гаспадарцы ня менш 3-х год і сяляне-калгасьнікі, пераважна беднякі, працуючыя непасрэдна на сельскай гаспадарцы пры ўмове 2-х гадовай актыўнай камсамольскай работы ва ўзросьце ад 18 да 20 год уключна.

Увага: у адносінах да паступаючых камсамолак стаж актыўнай грамадзкай работы можа быць зьніжаны да 1 году і ўзрост ня вышэй 21 году.

5. Падрыхтоўка паступаючых павінна быць у наступным аб'ёме: умець добра чытаць і пісаць, як пабеларуску, так і парасійску. Па матэматыцы ўмець рабіць арытмэтычныя деяньні над цэлымі і дробамі. Умець арыентавацца па карце, ведаць краі сьвету. Па грамадзкіх дысцыплінах: гісторыю УсеКП(б), веды ў аб'ёме падручнікаў Валасэвіча, знаёмства з асновамі палітэканоміі, прыблізна ў аб'ёме падручніка Леонцева, пачатковая палітэканомія.

Гісторыю юнацкага руху па Шохіну. Праграму і статут УсеЛКСМ. Пастановы VIII зьезду УсеЛКСМ, IV канфэрэнцыі і апошніх пленумаў ЦК УсеЛКСМ і ЛКСМБ.

Арыентавацца ў бягучых падзеях па газэтах.

Увага: праграмы будуць высланы ўсім дапушчаным да іспытаў па асабістых адрасох.

6. Асобы з заразнымі, у тым ліку з вэнэрычнымі хваробамі, нэўрастэніяй, сухотамі і інш. прымацца на курсы ня будуць.

Увага: інваліднасьць сама па сабе ня можа служыць перашкодай для паступленьня на курсы.

7. Дапушчаныя да іспытаў падрыхтоўваюцца і не пазьней 15-га жніўня 30 г. накіроўваюцца ў Камуністычны Унівэрсытэт у гор. Менск, дзе з 15 па 25 жніўня 30 г. праводзяцца іспыты курсантам. Заняткі пачнуцца з 1-га верасьня 30 г.

8. Асобы, якія ня вытрымаюць іспытаў, а таксама асобы, якія хоць і вытрымаюць іспыты, але ня зьявяцца да 1 верасьня на курсы, будуць варочацца за свой кошт на месца ранейшай працы, якая захоўваецца за паступаючымі да канчатковага залічэньня іх на курсы.

Веды правяраюцца ў аб'ёме, паказаным ў п. 5.

9. Арганізацыі, якія камандыруюць, павінны:

Паклапаціцца аб дарожных выдатках камандыраваным у абодва канцы.

Прыняць на сябе забесьпячэньне сям'і камандыраваных.

Паклапаціцца, каб камандыраваныя мелі з сабою бялізну, абутак і вопратку.

Паклапаціцца аб разьліку на месцы працы і здавальненьні курсантаў выходнай дапамогай.

Выслаць пастанову адборачнай камісіі, уласнаручна запоўненую, асабовую картку, засьведчаную АК, жыцьцяпіс і характарыстыку аб грамадзкай працы курсанта не пазьней 15-га сакавіка 1930. Іншыя дакументы: спраўку аб стане здароўя, расьпіску аб азнаямленьні з умовамі прыёму, спраўку аб апошняй працы—паступаючыя павінны прывезьці з сабою. Без пералічаных дакумантаў накіраваныя кандыдаты да праверачных іспытаў дапушчаны ня будуць.

10. У камуністычным унівэрсытэце курсанты забясьпечваюцца інтэрнатамі, стыпэндыямі і пасьцельнымі прыладамі.

Увага: З-за адсутнасьці інтэрнатаў для сямейных, з прычыны кватэрнага крызісу ў Менску, Камвуз не бярэ на сябе ніякай адказнасьці па забесьпячэньні кватэрамі сем'яў курсантаў.

11. Агульны набор курсантаў—90 асоб. Месцы разьмяркоўваюцца па акругах наступным парадкам: Менск—17, Гомель—14, Віцебск—14, Бабруйск—11, Магілеў—11, Ворша—9, Мазыр—7, Полацак—7.

Арганізацыі накіроўваюць у адборачныя камісіі пры кам. ун-це на 50 проц. больш патрэбнага па раскладзе ліку кандыдатаў для адпаведнага адбору.

12. Пасьля сканчэньня курсаў курсанты паступаюць у распараджэньне ЦК ЛКСМБ і скарыстоўваюцца на камсамольскай працы.

Заг. Аддзелам прапаганды і культуры ЦК КП(б)Б СЯНКЕВІЧ.
Сакратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.
Рэктар Камвузу Беларусі САЕВІЧ.

Набор у лік „1000" у с.-г. ВНУ

Пачынаецца набор у лік «тысячы» ў сельска - гаспадарчыя ВНУ на 1930-31 год.

Паводле пастановы ЦК УсеКП(б) у лік «тысячы» ў с.-г. ВНУ па наборы 1930-31 году ЦК КП(б)Б прадастаўлена 25 месц.

Па асобных акругах гэтыя месцы разьмеркаваны наступным парадкам:

Менск — 9, з іх ня менш 3 жанчын, Віцебск — 7, жанчын — 3, Гомель — 6, жанчын — 2, Бабруйск — 4, жанчын—2, Магілеў — 4, жанчын — 2, Полацак — 3, жанчын—1, Мазыр — 3, жанчын — 1, а ўсяго 40 чалавек.

Склад камандыраваных у лік «тысячы» павінен адпавядаць наступным умовам:

1. У ліку камандыраваных павінна быць ня менш 70 проц. прамысловых і с.-г. рабочых.

2. Камандыраваныя прамысловыя і с.-г. і лясныя рабочыя, сяляне (беднякі) і чырвонаармейцы з рабочых і сялян павінны мець 5-гадовы партыйны стаж і 3-4 гадовую практыку грамадзкае работы, а служачыя — ня менш 7 год партстажу і 6-7 год адказнай прафэсыянальнай і адказнай работы.

3. Узрост камандыраваных — ня вышэй 35 год.

4. Камандыраваныя павінны мець сяраднюю асьвету ў аб'ёме рабфаку, 9-годкі, ці павінны прайсьці спэцыяльныя падрыхтоўчыя курсы і завочную падрыхтоўку па матэматыцы, фізыцы і расійскай мове.

Адбор у с.-г. ВНУ робіць камісія, вылучаная для адбору ў ВТНУ.

Адбор кандыдатаў павінен быць скончаны акругамі не пазьней 10 красавіка і ўсе матар'ялы прадстаўлены ў ЦК—15 красавіка.

Цэнтральная камісія павінна скончыць адбор да 25 красавіка.

Усе таварышы, зацьверджаныя Цэнтральнай Камісіяй УсеКП(б), буцьць арганізаваны і могуць быць аслабонены толькі пастановай апошняй.

Акруговы павінны прыняць усе меры да падрыхтоўкі таварышоў праз арганізацыю спэцыяльных курсаў, груп пры існуючых курсах па падрыхтоўцы ў ВТНУ, ці праз наладжаньне індывідуальнай дапамогі таварышом у падрыхтоўцы.

Для ўсіх кандыдатаў, якія зацьверджаны ЦК УсеКП(б), будуць арганізаваны курсы ў Менску тэрмінам ня менш 2-х месяцаў з вызваленьнем ад працы і захаваньнем пэнсіі.

КУЛЬТПРАП ЦК КП(б)Б.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— **Вячэрняя саўпартшкола.** Сэмінары для кіраўнікоў палітэканоміі ВСНШ па тэму «Да дыскусіі ў палітэканоміі» адбудзецца ў памяшканьні Дому Камасьветы (п. № 19). Кіраўнік т. **Аксэльрод.** Пачатак у 19 гадзін Адначасова кансультацыя па заданьні «Дадатковая вартасьць».

— **Дом Камасьветы.** У 19 газ. лекцыя т. **Сталевіча** для партыйнага і камсамольскага актыву на тэму: «Рэвалюцыйны рух у Зах. Беларусі». Пасьля лекцыі канцэрт Белрадыёцэнтру. Білеты па райкомах КП(б)Б і ЛКСМ.

— **Масавая кансультацыя** на тэму **«Амэрыканскі эканамічны крызіс і яго ўплыў на іншыя краіны»** для парт. і камсам. актыву—у Доме Камасьветы (п. № 19). Пачатак у 19 гадз.

— **Дом Пісьменьніка.** Агульны сход пісьменьнікаў гор. Менску—у 19 з пал. гадз. Парадак дня: справа «Саюзу Вызваленьня Украіны». Запраш. мастакі журналістыя, навуковыя працаўнікі і кампазытары.

— **Пасяджэньне жансэкцыі Фрунзаўскага РК МОПР'у** разам з прадстаўнікамі і сакратарамі жактаўскіх ячэек МОПР'у—у памяшканьні АК МОПР'у. Пач. у 18 гадз.

— **Дом Асьветы.** Вечар крытыкі і самакрытыкі працы фарпосту ў школе. Уступнае слова члена ЦК ЛКСМБ. Пач. у 20 гадз.

— **Рэсп. бюро АРУ.** У 19 гадз. у памяшканьні АРУ (Савецкая, 65), чарговае пасядж. бюро АРУ разам з актывам па пытаньні аб рэарганізацыі структуры АРУ.

— **БДУ.** *Выбары прафкому факультэтаў народнае гаспадаркі і савецкага будаўніцтва—у 19 гадз. (ранейшыя выбары, што адбыліся 5 сак., выканбюро прафсэкцыі БДУ адмяніла). Яўка студэнтаў абавязкова.*

— З 10-III па 1-IV-30 г. біб-ка Дому Асьветы будзе праводзіць перарэгістрацыю чытачоў біб-кі.

Перарэгістрацыя будзе адбывацца ад 6 да 11 гадз. увечары. Асобы, якія не перарэгістраваліся да паказанага тэрміну, будуць лічыцца мэханічна выбыўшымі з біб-кі. Для перарэгістрацыі неабходна мець сяброўскі клюбны білет.

Бібліятэка Дому Прапасьветы апошні раз паведамляе таварышоў, якія трымаюць у сябе кніжкі больш двух тыдняў зьвярнуць іх у пяцідзённы тэрмін.

Ня зьвярнуўшыя ў паказаны тэрмін будуць прыцягнуты да адказнасьці.

ЗАЎТРА

— **Клюб «Мэдпрацаўнік».** У 21 гадз. адбудзе. 2-е пасяджэньне менскай навуковай асацыяцыі пры саюзе Мэдсанпрацы. Парадак дня: 1. Дэманстрацыя хворых, 2. Аб захворваньні на эфміэзэму і сухоты ў шкладуваў (дакл. д-р Фэйгін), і 3. Раптоўная сьмерць пры эндопаразытах мозгу. Запраш. рабочыя гуты «Пралетары».

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

— **Пэдгабінэт.** Лекцыя інж. **Добкіна** на Эльводзе для выкладчыкаў фізыкі на тэму: «Сілавыя ўстаноўкі электрастанцыі». Пач. у 19 гадз.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

У аўторак, 11-га сакавіка, у памяшк. АК МОПР'у
АДКРЫВАЕЦЦА
II-гі ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА АКРУГКОМУ МОПР'у.
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Справаздача прэзыдыуму Мен. АК МОПР'у.
2. Даклад аб новых формах і мэтадах працы.
3. Справаздача Барысаўскага РК МОПР'ў.
Яўка ўсіх членаў і канд. АК і рэв. кам. АК абавязкова.
Запрашаюцца члены гарадзкіх РК і ячэйкоў актыў.
Пачатак роўна а 6 гадз. увечары.
Менакругком МОПР'у

КЛЮБ ДРУКАРОЎ. У аўторак, 11-га сакавіка АДБУДЗЕЦЦА
АГУЛЬНЫ СХОД ПРАФАКТЫВУ САЮЗУ ДРУКАРОЎ
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Даклад аб выніках усебеларускай арганізацыі і добраахвотніцтва. Дакладчык—член прэзыдыуму ЦСПСБ т. Клімковіч. 2) Мастацкая частка.
Яўка членаў ЦП, сэкцыі друку, ФЗК, зборшчыкаў чл. узносаў, членаў усіх камісій ФЗК абавязкова.
Запрашаюцца ўсе рабочыя.
Пачатак а 7 гадз. 30 мін. Ц. П. САЮЗУ ДРУКАРОЎ.

15-га сакавіка а 7 гадз. увеч. ў памяшк. клюбу мэталістых у Менску адкрываецца
I-ая УСЕБЕЛАРУСКАЯ МІЖСАЮЗНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб чарговых задачах фізкультурных арг.—(Рыжоў).
2. Аб становішчы і задачах фізкультурнай работы ў прафсаюзах Беларусі.—(т. Клімковіч).
3. Становішча міжнароднага рабочага спартыўнага руху.—(прадстаўнік спортінтэрна).
4. Аб усесаюзным сьвяце фізкультуры прафсаюзаў.—(Смарчкоў).
5. Выбары Бюро ФК ЦСПСБ.
6. Бягучыя справы.

16 сакавіка, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні райкому КП(б)Б м-ка КРЫЧАЎ склікаецца рэдакцыямі газэт «Зьвязда» і «Камунар Магілеўшчыны» сумесна з Крычаўскім райкомам КП(б)Б
РАЁННАЯ НАРАДА СЕЛЬКОРАЎ Крычаўскага раёну, Магілеўскай акругі
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Задачы селькораў у раёне сацыяльнай калектывізацыі.
2. Аб арганізацыі насьценных газэт пры калгасах.
На нараду павінны зьявіцца рэдактары насьценгазэт, усе рабкоры, селькоры і сьпенкоры. Запрашаюцца калгасьнікі.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" 3 панядзелка, 10 сакавіка
2-гі тыдзень. З прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень.
У АГНІ НАРОДЖАНАЯ
Сцэнары і кансультант—А. ВОЛЬНЫ. Рэжысэр—В. КОРШ. Аператар—Д. ШЛЮГЛЕЙТ.
У галоўных ролях: Ганна Заржыцкая, Мікола Вітаўтоў, Барыс Азараў, Васіль Чудакоў.
Пачатак роўна а 7 гадз. —()— Каса—ад 5 гадз.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" 3 панядзелка, 10 сакавіка
замежны мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК АГНЮ
Рэжысэр—ЭРЫХ ВАШНЕК. У галоўных ролях:
Ольга Чэхава, Хэльга Томас, Рудольф Рытман, Генры Сьцюарт.
Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса—ад 5 гадз.

Дзяржаўны Гурэйскі Тэатр БССР
Аўторнік 13 сакавіка
Чацьвер 13 сакавіка
для школы імя Чарнякова.
Білеты ў школе (Савецкая вул.) і ў касе тэатру.
З. ТОЛЬЛЕР.
ГОП-ЛЯ, ЖЫВЁМ
Пачатак а 8 гадз. 30 м.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
3 панядзелка, 10 сакавіка
мастацкі хранікальны фільм
УПАД
Дынастыі Раманавых
у 7 частках.
ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ
Пачатак 1 сэансу а 2 гадз., 2-га—а 3 г. 30 м.
Каса адчынена а 12 г.

Кіно „СПАРТАК"
БАЯВІК! 3 панядзелка, 10 сакавіка БАЯВІК!
КНЯЖНА МЭРЫ
паводле раману Лермантава.
Драма ў 8 частках.
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз.)—(Каса—ад 5 гадз.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
11 і 12 сакавіка адчынены спэктакль
„ЦЫРУЛЬНІК З СЭВІЛЬЛІ"
опэра ў 4 дз., муз. РАСІНІ.
Білеты ў рабкасе а 12 да 2 і ад 4—6 у касе тэатру.
Пачатак ад 8 з палов. гадз. увечары.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"
3 панядзелка, 10 сакавіка
мастацкі фільм, вытворч. „Арменкіно"
НЯВОЛЬНІЦА
драма ў 6 частках.
Рэжысэр А. ЯЛОВЫ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
заслужаны артысты ССРА—А. Асьмін,
артыстыя Н. Манучарян, М. Надатова.
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз.
Каса—ад 5 гадз.

Беларуская Дзяржаўная Акадэмія сельскае гаспадаркі
АБВЯШЧАЕ,
што ёю праводзіцца ўвесну прыём студэнтаў на наступныя факультэты:
а) арганізацыі і эканомікі буйнов сельскае гаспадаркі . . . 24 асобы,
б) факультэт расьлінаводзтва . 26 асоб,
в) факультэт жывёлагадоўлі . 25 асоб,
Усяго ў парадку вольнага прыёму . . . 75 асоб.
Прыём заяў будзе праводзіцца з 10-га сакавіка па 25-га сакавіка.
Да заяў павінны быць прыложаны наступныя дакументы:
1) Анкета, засьведчаная мясцовай арганізацыяй ці установай. 2) Аб адукацыі. 3) Метрыка. 4) Аб матар'яльным становішчы бацькоў да рэвалюцыі і пасьля і не пазбаўленьні выбарчых правоў. 5) Аб адносінах да вайсковай павінасьці (копія). 6) Аб стане здароўя. 7) Тры фота-карткі. 8) Водзыў аб працы—грамадзкай і на вытворчасьці і марак паштовых на 20 коп.
Іспыты будуць праводзіцца па праграме за курс рабфака з 25-III па-IV г. г.
Ад іспытаў ослабляюцца скончыўшыя рабфакі, тэхнікумы і курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.
Расклад месц па сацыяльных групах устанаўляецца: ня менш 90 проц. рабочых, батраноў і беднякоў-калгасьнікаў, астатнія месцы прадстаўляюцца тым сацыяльным катэгорыям, якія маюць права на паступленьне ў ВНУ.
Рэктар Акадэміі П. І. ПІНЧУК.

ВЫШЛІ З ДРУКУ
і паступілі ў продаж
У. І. ЛЕНІН.
ЗАДАЧЫ САЮЗУ МОЛАДЗІ.
Стар. 35. Цана 10 кап.
А. КЛІБАНАЎ.
КАМСАМОЛ НА ФРОНЦЕ БЯЗБОЖЖА.
Як весьці камсамолу антырэлігійную прапаганду.
Стар. 95. Цана 25 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ВЫШЛА з ДРУКУ
і разаслана па вайсковых частках
ПРАГРАМА ПАЛІТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ
з чырвонаармейцамі
РАЗЬДЗЕЛ ЧАЦЬВЕРТЫ.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ЭЛЬВОД паведамляе, што, в прычыны вычысткі катлоў, будзе СПЫНЕНА ПАДАЧА ЭЛЕКТРАЭНЭРГІІ
на працягу некалькіх дзён
з 6 да 10 гадз. увечары
у раёнах: Першамайскай, Акольнай, Гарбарнай, Савецкай (у бок Камароўкі), Доўгабродзкай, Чырвонасьцяжнай, Гандлёвай, Кастрычніцкай, Садовай, Пралетарскай і Кацярынінскай вуліц, а таксама Ніжняга рынку.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяндзе па тэл. 2-49

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Згубленыя і ўкрадзены наступныя дакументы лічыц несапраўднымі:
Вайск. кн., выд. Мен. ваенкамат камсам. біл., выд. Мен. АК ЛКСМ пасьведч., выд. рахунк. курс. пры Н БССР на імя Емельянчыка Я. 434—
Асабов. пасьведч. Рэгінбогэна Я. выд. Белшклотрэстам
Пашпарт № 50/ш Шэйнгаўза Е. выд. Мен. міліцыяй
Чл. біл. саюзу хэмікаў, вайск. выд. Варысаўск. ваенкаматам на Макарэвіча А. І. 439—
Патэнт Ліпака Е. Л., выд. Мен. Ак
Чл. кн. саюзу будаўнікоў Граната
Даведка аб выбарч. правох Роз В. С., выд. Мен. міліцыяй
Пасьведч. Фрыдмана М. Я., выд. к дзесятн. будаўнікоў
Асабов. пасьведч. № 101/к Кунц В. В., выд. Адда. сл. экспл. МБВ
Чл. біл. саюзу будаўнікоў № 6/ Ліцэгос
Вайск. кн. Кулешова І. Д., выд. палком
Чл. кн. № 48932 Перэльмана Я., ТПО МБВ ч.
Даведка аб працы Голуба Ф. Г. к-рай «Продасындикат»
Асабов. кн. Сьцебуля А. К., выд. махвалаўск. РВК
Чл. біл. саюзу працасьветы № Курлянд Д. Х.
Мэтрыч. вып. Зіганчыка У. М., Мен. ЗАГС'ам
Вайск. біл. Жывіцкага П. М., Кемскім адмадзе.
Пашпарт Стыдзель Э. К., выд. міліцыяй
Пасьведч. на атрыманьне дапам. рэль Б. І., выд. Менакрсабезам
Асабов. кн. Капача М. Д., выд. ваенкаматам
Чл. кн. саюзу працасьветы Гама М. І.
Чл. кн., выд. Койд. т-вам самат пашпарт, выд. Койдан. с. с. на імя кіноўскага Г. Я. 45
Пасьведч. № 163/л Пустаход А., Менакрсабезам
Асабов. пасьведч. Сянькова выд. к-рай і вуч. Рыга-Арл. чыг.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" звяндзе па тэл. 7-81

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўліт № 33